

**Філіп Топал/ Filip Topol (нар. 1965)** – Дагэтулешняя празаічная творчасць Філіпа Топала ўключае ўсяго тры невялікія творы, якія разам змяшчаюцца менш чым на 100 старонках, і, тым не менш, дазваляюць гаварыць пра аўтара як пра вельмі таленавітага празаіка. “Мне 13” (Mně 13), напісаная, як паказвае назва, у 13 гадоў, але выдадзеная ўпершыню ў 1995 годзе.

**Мне трынаццаць**
(Mně 13)
**(Жыццё ў Празе)**

*Яхіму Топалу*

(Я думаю, абыдземся без прадмовы,
прадмову хай кожны прыдумае сам…)

Маё імя Патрык, але сябры называюць мяне Патам, таму я Пат. Я самы малодшы з чэшскіх вілюзіяністаў (маю да гэтага такое-сякое дачыненне) і хачу толькі сказаць, што тут я напішу абсалютную праўду, напішу толькі тое, што перажыў. А вы, калі я пра вас напішу нейкую рэальную праўду, скажам, пра вашыя няўхвальныя рысы характару і да т. п., не злуйцеся, бо тут усё праўда, а мы толькі жывёлы, якія называюць сябе людзьмі, што ж зробіш. Дык вось:

“Ісціна пераможа”.

(Хачу яшчэ верыць, ці, можа, ужо не…)

Дзень сёння быў бязладны. Мы дамаўляліся, што дзесьці а трэцяй, нават трохі раней, сустрэнемся з парай чалавек у “Маластранскай” і пойдзем да Гонзы, каб аддаць яму нашыя опусы, бо ён збіраецца рабіць нейкі зборнік. Гонза – пераплётчык, дык хоча з нашых твораў зрабіць кніжку. Каб быць справядлівым, скажу, што ён вучыцца на графіка на вечаровым у Геліхаўцы[1]. Учора я даў пачытаць некаторыя свае рэчы, якія называю прозай, Дастлі, і сёння а палове на трэцюю ў “Маластранскай” ён мусіў мне іх вярнуць. Дастлі – бісэксуал. Мяне гэта раздражняе, але я ведаю, што да мяне ён падкатваць не будзе, ён сам мне гэта сказаў. Бо калі б паспрабаваў, нашаму сяброўству прыйшоў бы капец. Ён пра гэта ведае і не хоча, каб так здарылася. Я Дастлі ўспрымаю спакойна. Ён бітнік і ўвесь час трындзіць. Перад кавярняй я сустрэў Марка. Марэк – наш басіла, старэйшы за мяне на паўгода. Ён яшчэ не прыцёрся да нас, але з ім прыкольна. Хоць часцей за ўсё ён альбо нейкі

[1] Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая графічная школа ў Празе. Назва – паводле месцазнаходжання на вуліцы Геліхавай.

ПрайдзіСвет

збянтэжаны, альбо не ў гуморы. Тут выбіраць не даводзіцца. Усярэдзіну мы зайшлі разам. Там быў Боршч. Ён класны хлопец. Яму, здаецца, каля дваццаці, і Баршчом яго называюць таму, што ён носіць шапку з барана. Ён толькі вярнуўся з Богніцаў[2], цяпер піша і малюе іерогліфы. Але ён праўда файны. Мы пазнаёміліся, калі я неяк сядзеў у той самай "Маластранскай кавярні". Мы тады якраз курылі маруху (смакам была як суп з ялавічыны), ён зайшоў, забіў касяк і перакінуўся з намі колькімі словамі. Пасля схапіў мяне за шыю ды кажа: "Братан, ты мне падабаешся, нават не ведаю, чаму". Пры гэтым вывернуў мне галаву і страсаў мне попел на морду. Так мы і пазнаёміліся.

Пасля туды прыйшла Марго. Яна мне ўжо лезе на нервы, і няхіла так лезе. Я кахаў яе, але гэта было даўно. Пасля яны былі ў гарах, і калі яна вярнулася, яе быццам бы падмянілі, стала такая тупая. Марэк пайшоў, сёння ён быў збянтэжаны. Мы чакалі Дастлі. Я ўжо пачаў баяцца, што ён не прыйдзе, але прыйшоў, прынёс мне мае тэксты і па-ангельску перапісанага Уільямса. Мы заплацілі і звалілі. Ага, яшчэ туды прыйшоў Ёзэф. Напраўду яго завуць Якуб, але ён хоча, каб мы называлі яго Ёзэфам. Ёзэф дык Ёзэф. Гэта мой брат. Між іншым, таксама адзін са стваральнікаў вілюзіянізму, піша файныя рэчы. Але ў яго звычайна настрой храновы. Мы пайшлі на Замкавую лесвіцу, там быў Гонза. Па дарозе мы сустрэлі яшчэ Квіда і Пэтра. Яны клёвыя пацаны. Квіда малюе цікавыя карціны, а Пэтр піша ў духу сюррэалізму і грае на бубнах у Квідавым гурце. Яны абодва мне падабаюцца. Мы аддалі Гонзу свае творы і пайшлі ў кавярню. У сэнсе, яны. Мы з Баршчом незаўважна аддзяліліся і пайшлі да Ваята. Гэта такі мастак. Боршч яго амаль не ведаў, дык хоць пазнаёміўся. Мне здаецца, што Ваят заўжды нейкі такі нерашучы. Быццам не ведае, што да чаго. Мы трохі пасядзелі ў яго, а пасля зноў звалілі. Пайшлі па Нэрудавай, бо Боршч хацеў зазірнуць у "Сонцы", ці няма там каго са знаёмых. Нехта быў, такі патлаты і барадаты. Яны трохі патрындзелі, і мы зноў пайшлі. Але ўжо нікога не знайшлі. Квіда з Пэтрам ужо паехалі ў Бэхіню, і я раззлаваўся, бо Квіда збіраўся мне штосьці сказаць. Урэшце мы сустрэлі Бэрэніс. Ейныя бацькі – французы ці што, і яна, здаецца, таксама. Мы зайшлі ў буфет перакусіць, а пасля я паваліў дадому.

Як жа мяне задзяўбла школа. Хоць, зрэшты, і ў школе былі прыемныя моманты. Аднойчы я чакаў Міхаэля. Ён трэці сярод самых маладых вілюзіяністаў. Першы – я, другі – Марэк, а трэці – ён. Яму, здаецца, чатырнаццаць, Марку таксама, а мне трынаццаць. Ну дык вось, чакаю я яго, каб дамовіцца наконт заўтрашняй рэпы нашага гурта. Чакаю гадзіну, а яго няма. Калі захварэў, то рэпа ў жопу. А другой бачу – ідзе, усміхаецца. Я да яго: "Здароў, Міха. Ты дзе быў? Я ўжо не ведаў, што рабіць, думаў, ты не прыйдзеш".

"Мне сёння было так клёва. Ведаеш, Пат, я быў у бабулі ў Бэнэшаве. Добра, што ўзяў з сабой падручнікі, думаў, павучуся. Спазніўся ўчора на

[2] Богніцы – раён у Празе, дзе знаходзіцца псіхалячэбніца.

prajdzisvet.org

апошні цягнік. Дык сёння раніцай, недзе а шостай, сабраўся і пайшоў з торбай на шашу. Тармазнуў грузавік, і ён падкінуў мяне да самай Прагі. Я ляжаў у кузаве і зубарыў гісторыю. Гм… было клёва. Не, ну праўда”.

Вось такі ён. Калі з ім трохі даўжэй пагаварыць, здаецца, што ён псіх. Але напраўду Міхаэль добры хлопец. Я ўжо навучыўся з ім размаўляць, але гэта пакуль не ва ўсіх выходзіць. Ён грае ў нашым гурце на бубнах. Наш гурт называецца “Псіхадэлічны брэх”. Марэк грае на басе, Міхаэль – на бубнах, а я спяваю і граю на фартэпіяна. Ага, Марэк таксама будзе граць на электраскрыпцы. Акрамя таго, Міхаэль яшчэ малюе, а цяпер пачаў пісаць такія трохі дзіўныя рэчы.

На гэтым тыдні нічога цікавага, дык я не магу дачакацца пятніцы, калі ў кавярні зноў будзе вялікае шоў. Толькі адна штука мяне непакоіць, а менавіта маруха. То бок, я пазнаёміўся з адной дзяўчынай, якая паабяцала, што мне яе раздабудзе. Званю ёй, а яна кажа, што мусіць дамовіцца з адным пацаном. Праз два тыдні я ёй зноў патэлефанаваў, яна сказала, каб назаўтра я быў у “Маластранскай”, прыблізна а шостай. Паабяцала, што прынясе. І не прыйшла. Больш я ёй не тэлефанаваў. І ўсё ж трэба звякнуць. Бо пакумарыць хочацца. Аднойчы я ўжо выдыміў касяк. Гэта быў гашыш. Я дастаў яго ў нейкіх італьянцаў. Дзіўныя рэчы ён са мной тварыў. Мы тады разам курылі. Я, Ёзэф і Марго. Ім – нічога, а вось мне… Спачатку здавалася, што я лётаю. Пасля я паваліўся на падлогу і гадзіны дзве, здаецца, вадзіў пальцам сабе па мордзе. Памятаю, што я чуў, быццам кукарэкае певень і кудахтае курыца. Той певень мне дзіка лез на нервы, а вось курыца, яе сакатанне было такім ласкавым. Тупа, праўда? У канцы таксама было супер. Я ўжо мог хадзіць, калі б і не хацеў, то быў бы вымушаны. Я хадзіў, як бусел. Уздымаў ногі, як Армстронг на Месяцы. Я ўвесь час усміхаўся, як ідыёт, але было добра. Я стаў такі слабы-слабы, і ўсё ляжаў, разваліўшыся на падлозе, і вадзіў сабе пальцам па твары (навошта – не ведаю). Я б хацеў параўнаць гашыш з марыхуанай. Кажуць, маруха слабейшая.

Дзіўныя цяпер дні, такія хаатычныя. Мне хочацца занатоўваць пра сябе кожную дробязь. Паліцаі пра мяне і Ёзэфа ведаюць шмат; сярод нас, відаць, аціраецца нейкі ў штацкім. Аднойчы мы з Ваятам сядзелі ў кавярні, там быў адзін, уставіўся на нас і зырыў. Нас абодвух раптам апанаваў жах, і мы адразу ж звалілі. Учора мяне ахапіў такі самы жах, калі я даведаўся, хто сярод нас шпягуе. Здаецца, гэта Ладзя Міцка, учора выпытваў у мяне пра бацьку. Калі тое, а калі тое, а што, а як і г. д. Да Бланкі таксама ўвесь час чапляўся… Гэты свет паскудны, бо вось ён, магчыма, шпег, а калі не, то, можа, вунь той. А калі Міцка не шпег, тады я засранец, бо так пра яго думаю. Але ж ён, здаецца, усё-ткі шпег. Уласна, мне пофіг. Учора было супер. Я быў п’яны, і ў кавярні пазнаёміўся з адной дзяўчынай – Іткай. Яна такая клёвая. Калі мне надакучыць Марта, Ітка ёй будзе класнай заменай. Не, сур’ёзна. Я ж вось так ад балды не закахаюся. Ну, пасля будзе відаць… Яна дала мне панасіць пярсцёнак, ці я сам яго ўзяў, ужо не памятаю, я падліваў сабе ў

ПрайдзіСвет

гарбату гарэлку, якую прынёс з сабой, я быў ва ўдары. Я ёй бясконца казаў нейкую дурню. Напр.:




"А пасля мая нага закахалася ў маю дырэктрысу, і цяпер у іх – сумесь бегемота з насарогам, а ў таго насарога – агромністы рог, пра які ўвесь час крычыць той імпатэнт і дэбіл патрык, які б'ецца галавой аб стол, страсае попел ітцы на галаву і выдзімае ёй дым у твар. А той малы прыгожы індус, ну той, ад якога ў маёй дырэктрысы бегемот+насарог з патрыкавай нагой. А вінаваты ва ўсім вось гэты пярсцёнак, які напіўся маёй нагі і гарэлкі, а яна будзе піць яго п'янае срэбра, засне і прысніць дырэктрысінага аднаножку, які будзе дыміцца над патрыкавай гарбатай. Гэта той? Але ж яна мая дырэктрыса, і не Брымава, а Бірмава. З той адзінай патрыкавай нагой ад таго насарога+бегемота. А… а… а-а-а… пры гэтым усе будуць біцца галавой аб стол і клікаць таго імпатэнта і дэбіла патрыка, ідзіце ў Майстэрню міма "Мая"…"

prajdzisvet.org

ПрайдзіСвет




Карацей, такі вось ідыятызм. Усё гэта я падслухаў, калі сядзеў пад мухай, з размовы Іткі з Маркетай і Іткі са мной. Але гэта ўсё страшна перамяшанае і перакручанае. Хрэнь, але такая цудоўная (это чудесно): пасля прыйшоў псіх Боршч і ўкусіў мяне за шчаку, і цяпер у мяне там чырвоны засос. Ён гарланіў, скакаў з парасонам на машыны і шукаў вядро на піва. Я падышоў і даў яму пустую пляшку з-пад гарэлкі.

"Яна ж пустая," – сказаў ён апавядальным сказам, і фюіць – пустая пляшка праляцела метраў дваццаць па плошчы. Перад "Маластранскай" сабралося страшэнна шмат людзей: Квіда, Ёзэф, Ваят, Густэл, Ітка, Маркета, Робін, Ярка, тая францужанка – ага, Бэрэніс, Злая Моркаўка тут як тут, Дастлі, Боршч, Марцін, Алекс, Леанард, Ян Ванэк і яшчэ, здаецца, чатыры дзеўкі. Раптоўна на ўсю плошчу як грымне: "Едзеееем!" (Боршч), усе пачалі шчаміцца ў трамвай, чалавек дзесяць не ўбіліся. Мы паехалі да Баршча ў

prajdzisvet.org

Галешовіцы на хату. У трамваі мы з Бланкай абгаварылі Міцку. Потым зноў на цэлы трамвай: “Выхооодзім!” (Боршч). Боршч выскачыў з трамвая, і толькі і чуваць было, як затармазілі машыны. Мы – за ім. Пасля зноў: “Тудыыы!” (Боршч), усе павалілі ў нейкі буфет, дзе былі адны рабацягі, набралі (на жаль, я спадзяюся, што так не скончу) штук трыццаць бутэлек піва, віно і ром. Урэшце мы прыпаўзлі да яго на кватэру. Не кватэра, а сапраўдны прытон. Мяне ахапіў настрой, быццам я начытаўся Керуака. Я там быў. Як след набраўся, а Боршч прыгатаваў жахлівы напой. Нагрэў віно і ром, а пасля змяшаў. Жахліва востры. Пасля ён яшчэ ўсыпаў туды нейкія парашкі і заснуў. Але я гэтага ўжо не бачыў, бо разам з Бланкай і яшчэ нейкімі людзьмі зваліў. Бланка пайшла яшчэ да нас. Я ніяк не мог заснуць, увесь час у галаве стаяла тая балбатня з Іткай, кадры з тварамі знаёмых людзей, а вакол бесперастанку ездзіў на ровары “маёр” Міцка і нешта пазначаў у чорным сшытку. Прыблізна а першай прыйшоў брат. Зусім цвярозы. Памятаю, што я, быццам прывід, папрасіў у яго нейкі салат, а ён: “Не дуры, у салаце – маянэз, будзеш пасля бляваць”. Мне сапраўды хацелася бляваць, увесь час была адрыжка. Там, маўляў, было добра. Боршч абліў Злую Моркаўку півам і выкінуў яе з кватэры, а Ёзэф, кажуць, бегаў голы па кватэры і танчыў. Калі ўначы брат быў цалкам нармальны, то зранку прачнуўся зусім п’яны.

Я заснуў каля другой.

Цяпер мне паршыва (фізічна). Страшэнна баліць галава, не хапае паветра. МНЕ 13! Я не хачу перабольшваць, але я яскрава ўяўляю свае прагнілыя ад нікатыну лёгкія, а ў башцы, адміраючы, шалёна танцуюць клеткі. Я ведаю, што хутка памру. Я думаю, гадоў у дваццаць. Мне не надта каб хочацца. Я хачу штосьці зрабіць, хачу, каб пасля мяне штось засталося. Таму і пішу ўжо цяпер, шэсць гадоў граю на фартэпіяна і малюю. І завязваю з курэннем і п’янкамі…

На вуліцы – такі дождж! Я толькі што прыйшоў, на галаве ў мяне – вязаная шапка з пампонам, п’ю гарачую гарбату. Чакаю, пакуль прыйдзе Бланка. Спадзяюся, усё-ткі прыйдзе. Мама паехала на два дні ў камандзіроўку ў ГДР, дык мы тут зладзілі гудзёж. Учора ў нас быў кватэрнік.

Мне ўжо лепш. Хоць яшчэ крыху баліць горла, але хрэн з ім. Як я ўжо сказаў, учора ў нас быў кватэрнік. Было клёва. Хоць бы таму, што хлопцаў было шасцёра, а дзевак – дзевяць. Маці паехала ў камандзіроўку ў Германію, а бацька не прыйшоў. Мама пакінула нам з бацькам 150 крон на кожнага. На ежу і на ўсё астатняе. На пятніцу ў мяне, на жаль, засталося толькі 10 крон, бо 140 я патраціў на бухло: тры пляшкі віна, шампанскае і бутэлька рому. Я афігенна надраўся. Са мной адбылася адна лажа: я не пазнаваў, хто ёсць хто, спачатку я думаў, што Роланд пачне ўздымаць вэрхал. Я сядзеў у пакоі з Марыяй і братам. Той стаяў ля акна, я гукнуў яму: “Выкінь Роланда, выкінь Роланда!” Пасля памаўчаў, а калі чарговы раз падняў галаву на брата, зноў

сказаў: “Выкінь Роланда, выкінь!” Пачуўся смех, я прыгледзеўся, што там адбываецца, і ўбачыў, што звяртаюся да Роланда, а не да брата. Тупізм. Мяне гэта выводзіць. Бо я зноў быў у экстазе. Я ўзяў гітару, Гінзберга, і пачаў яго співаць. Пасля зусім пачаў раўсці, вакол хадзілі людзі, а я ўвогуле не разумеў, хто яны такія. Гэта доўжылася дзесьці з паўгадзіны, не ведаю дакладна. Пасля я ўбачыў, што ля мяне сядзіць Ваят. Які ж ён клёвы… Даў мне цыгарэту. Я быў зусім як дрэва, папрасіў Ваята, каб той зрабіў са мной што-небудзь, бо справы дрэнь. Такое поўнае здранцвенне. Але потым да мяне прыйшоў файны настрой. Я пачаў усіх цалаваць. Спачатку ўсё жывое, а пасля і розныя рэчы: мёд, шафу, лядоўню, стол, тэлевізар і ўсё астатняе. Там я пазнаёміўся з дзвюма дзеўкамі, адна была вельмі прыгожая. Радка. Потым мы з Марцэлай – сяструхай Ваята – пайшлі па віно. Я ў яе закахаўся, але гэта ўжо пасля. Мы трымаліся за рукі і ішлі ў “Кампу”. Там было зачынена. Мы вярнуліся. Я хацеў скочыць у Чартоўку, дзеля Марты (але гэта ўжо пасля). На шчасце, не скочыў, але калі я пералазіў цераз парэнчы назад, то паваліўся на зямлю, і ўсе рагаталі. Яна дапамагла мне падняцца. Пасля мы пайшлі па пляшку ў “Сэрцы”. Калі мы вярнуліся дадому, я яе адкаркаваў і пры гэтым абліўся. Усе = смех. Дзесьці а дзесятай, на жаль, усе звалілі. Шкада, мы б маглі тусавацца да самай раніцы, але ўсім трэба было ў школу. А я ў школу не пайшоў, бо прыбіраў той дзікі срач, які мы пасля сябе пакінулі. Уначы было зусім хранова. Мне зноў хацелася бляваць, але я, на шчасце, вытрываў. Раніцай у мяне быў нармальны настрой, я дапіў рэшту віна, якому парадаваўся, бо ненавіджу бадун, і пасля абеду пайшоў у музыкалку. Затым зазірнуў у кавярню. Там было шмат людзей, я быў рады, бо сярод іх быў і Боршч. Пасля туды ж прыйшоў брат і пачаў нас падбіваць, каб мы пайшлі на джаз. Вядома ж, надта напружвацца яму не давялося. Праз хвіліну мы сабраліся і павалілі ў “Рыхту”. Пасля мы планавалі пайсці ў “Парнас”, дзе мелася граць “Экспансія”. Мы паселі, купілі бутэльку чырвонага і слухалі музыку. Мяне падбешвала Марта, яна, на жаль, сядзела побач са мной, а таму я, хочаш не хочаш, быў вымушаны слухаць тую лухту, якую яна малола, напрыклад, каментавала музыку: “Мы вяртаемся ў трыццатыя, дамачкі ў капялюшыках, парасончыкі і белыя сабачкі…” А я ў гэты час думаў пра Керуака. У мяне было жаданне даць ёй падсрачнік. Я ўзяў акуляры Ёзэфа і ўставіўся на музыкаў, а яна пачала чаўпсці, як я інтэлігента выглядаю. Бляяя… Пасля перапынку мы сабраліся і думалі пайсці на “Экспансію”, але ніхто не захацеў. Гэта мяне страшэнна вывела. Брат з Пэтрай падняліся. Як я яе ў той момант ненавідзеў! Я пайшоў з імі, але на лесвіцы зразумеў, што ў мяне няма ні граша, вярнуўся, сеў, на душы было пагана! Як жа я іх тады ненавідзеў! Боршч мяне супакойваў, але гэта не дапамагала. Таўстуны, засранцы, ну і сядзіце тут на сваіх сраках. Казлы. Больш я не вытрымаў, выпрасіў у Мірыка бабло. Усё павінна быць у руху, перамяшчацца з месца на месца. Гайда слухаць джаз! На “Экспансію”! У “Парнас”! Я ўзяў свае манаткі, пазычаныя грошы і паляцеў. На вуліцы ішоў дождж і дзьмуў моцны

ПрайдзіСвет

вецер. Я нацягнуў на галаву сваю торбу і пабег за імі. Мне не было халодна, хоць бег я ў адным пінжаку і кашулі. Ёзэф – гэта асоба, гэта мой арыенцір. Я ўжо быў на Маластранскай, калі ўбачыў, як яны заходзяць у трамвай. Я спрынтануў так, як ніколі ў жыцці. Джаааааз, "Парнааас", усё павінна быць у руху, Керуак! Як шалёны, я заляцеў у трамвай і зароў: "Ёзэээф!" Кагосьці збіў з ног, сам паваліўся на зямлю, але я быў тут і быў разам з імі. Увесь мокры і выматаны, я пляснуўся на задніцу. На Уездзе мы зноў вылецелі з трамвая і скочылі ў абдымкі дажджу і ветру. Мы цягнуліся па вуліцы, прамоклыя да ніткі. Я яскрава бачыў Джэка Керуака, як яны бегалі па Фрыска, галодныя і мокрыя, з аднаго клуба ў другі. У "Парнасе" ўжо было да халеры народу, нас не пусцілі. "Экспансія", якую я чуў праз дзверы, грала проста супер.



"...Зноў папляліся ў "Рыхту". Брат добра так паляцеў, зачапіўшыся за ланцуг..."

Хутка мы зноў павалілі. Пад дажджом чакалі трамвая, тыя двое трохі цалаваліся, а мне хацелася бляваць. Я сядзеў на бардзюры, не было аніводнага трамвая. Нарэшце прыехаў, шасцёрка. Мы заскочылі і паехалі на Уезд. Там чакалі наступнага. Пасля паехалі на Маластранскую. Зноў папляліся ў "Рыхту". Брат добра так паляцеў, зачапіўшыся за ланцуг. Першае

prajdzisvet.org

ПрайдзіСвет

вясновае падзенне. Мы беглі, а Ёзэф роў: “На маёй дарозе – ланцугі, ланцугі!” Мы несліся далей. Сустрэлі Марту. Я чуў, як яна закрычыла: “Псіхі!” Я смяяўся і гарланіў: “На джаааааз!” Мы прыбеглі ў “Рыхту” – і канец…

Калі вы ўжо чулі Немэна, то можаце ўявіць, як гэта было. Невыпадкова адзін з альбомаў называецца “Катарсіс”. Проста шыкоўна. У мяне быў выдатны настрой. Мы забілі стрэлку ў “Маластранскай”. Я пайшоў туды з Міхаэлем, а там ужо быў Боршч. Пакрысе падцягваліся нашыя. Нас было шмат, але не столькі, як перад кватэрнікам у Баршча. Мы пайшлі праз Карлаў мост. Лёталі, крычалі, курылі, а ноч, што апускалася на зямлю, абдымала ўсё і ўсіх. Пацалункі зорак, пацалункі сяброў. Мы дабраліся да “Люцэрны”. Цікава, што сёння там не было паліцэйскага кардона, як звычайна, калі адбываліся нейкія канцэрты. Ян Ванэк, паэт-лірык, нават прайшоў без квітка. І хоць паліцаяў там усё роўна было, як мух, але яны нікому не дакучалі. І ўсё адно ад гэтага тупога адчування нікуды не дзецца. Роланд казаў, што ён сядзеў там ужо з шасці і чуў, як Немэн разыгрываўся. За кулісамі сядзела чалавек дваццаць паліцаяў і гуляла ў мар’яж. На сцяне ў іх вісела табліца, на якой яны запісвалі стаўкі. Калі Немэн разыгрываўся, чуваць было, як яны між сабой гаварылі: “Ёб тваю, што за гульня!” Альбо: “Бяры. Бля, у цябе банк. Давай казырнога,” – і г. д. Мы селі наверсе за стол, але ўсе разбегліся па “Люцэрне”. Я хадзіў з Марыяй, у мяне была сотня, дакладней, ужо толькі семдзесят (кавярня). Марыя была галодная, дык я купіў ёй талерку буцікаў і сок. Пасля нас спыніў хлопец з “Люцэрны”, даў нам пачытаць нейкі артыкул пра Немэна і хацеў крону, маўляў, на ліманад. Я сказаў, каб ён паклаў хрэн на ліманад і ішоў з намі піць віно. Пачаставаў яго шклянкай. Сам да таго моманту выжлукціў ужо дзве. Нарэшце мы знайшлі нашых. Яны сядзелі на стале, як гусі, стомленыя і заспаныя. Я шукаў вачыма Ёзэфа, зразумела, што яго тут не было. Тады я ўзяў і раскатурахаў Мірыка. Мы бегалі па “Люцэрне”. Я шукаў Ваята, знайшоў брата. Ёзэф цалаваўся на стале з Бэрэніс. Ён схапіў мяне за плячо і пачаў знаёміць з нейкай асобай. У гэтай асобы я спытаў, ці яна хлопец або дзяўчына. Гэта была дзяўчына, дык я яе пацалаваў. Брат прадставіў мяне незвычайным спосабам; зароў на ўсю глотку: “Гэта ёёёён!” – і качаўся па зямлі. Гэтая дзеўка была з той гімназіі, у якую я паслязаўтра буду здаваць уступныя іспыты. Божа мой. І зноў мы з Мірыкам туляліся. Пасярод гэтага нашага тулянн раптоўна бах – і мяне апанаваў дзіка паганы настрой, мне стала зусім сумна, і ўсё праз Марцэлу. Цяпер я ўяўляў сабой поўную супрацьлегласць таму, чым быў да таго моманту. Я павесіў галаву і туляўся па “Люцэрне” зусім без запалу. Ува мне чаргаваліся то злосць, то смутак, і страшэнна хацелася пісаць. А таму назаўтра я напісаў “Рухі”, я лічу, што гэта адзін з самых лепшых вершаў, якія я ўвогуле дагэтуль напісаў. Усе былі такія класныя, але мне ўжо было ўсё роўна. Боршч ціскаўся з Маркетай, Ваят з Бланкай, Ёзэф з Бэрэніс, астатнія ціскалі свае цыгарэты. Я пайшоў купіць яшчэ віна, а паколькі бармэн ужо ўсё

prajdzisvet.org

прыбраў, то я купіў цэлую пляшку. Я заліваў у глотку віно, хадзіў па “Люцэрне”, і ўсім, знаёмым і незнаёмым, даваў глынуць. Дадому я вярнуўся дзесьці а другой. З сотні ў мяне засталіся дзве кроны шэсцьдзесят гелераў. Але ж на канцэрце сапраўды было супер. Напрыклад, нейкая дзеўка папрасіла ў мяне цыгарэту. Я схапіў яе, і мы цалаваліся. Пасля я даў ёй цыгарэту і больш гэтую дзеўку не бачыў, і сумняваюся, што яшчэ ўбачу, бо было цёмна. Ёзэф – мая крыніца энтузіязму. Каб ЯГО не было, я б здох. У ім такі рух наперад, карацей, усё, ён папросту жыве і ўмее сабой кіраваць. Гэта бачна з ранейшых учынкаў. Я дапёр да яго галоўнай ідэі: трэба нешта рабіць, бо інакш усё будзе ўбогім і пакоціцца ў жопу. Праўда на ягоным баку, я ведаю яго і бачу, што калі б ён не пісаў такія файныя творы, не вілюзіяністнічаў, то звар’яцеў бы. Паколькі мы жывем разам, я, дзякуй Богу, таксама гэта ўсё адчуваю, а таму імкнуся далучыцца да ўсяго таго, што ён робіць. Як гэта класна, калі цябе возьме ў палон дэпрэсія і ты думаеш, што ты гаўно, што ты нуль і г. д.! Тут ты можаш узяць свае опусы і чытаць іх самому сабе ці хоць бы дзівіцца, як іх шмат. Тое самае з малюнкамі, музыкай і ўсім астатнім. Я пішу, малюю, граю, а цяпер яшчэ далучыўся да Марцінавага тэатра. Спадзяюся, што здам іспыты, і ўсё прыйдзе. Шалёныя тусы, джаз, рок, вечары ў кавярнях, праведзеныя за гутаркамі, каханне і г. д.

Гэта ўсё ў марах. Я здаў іспыты ў гімназію. Пазнаёміўся там з Дунаем, ён страшэнны ідыёт, пасля яшчэ з Гіцам, ён, кажуць, канчаны нарык. Яшчэ мяне там, нібыта, шукаў адзін патлаты, якога завуць Сонейка, ён хацеў даць мне малое сонейка як талісман. Шкада, што не знайшоў. Пра мяне ён чуў ад майго брата. Але ўсё па парадку. За дзень да гэтага я быў у кавярні, там са мной адбылася вось такая ідыёцкая прыгода. Я думаў, што хоць хтосьці прыйдзе, але ніхто не прыйшоў. Аднак гэта не ўсё. Я замовіў сабе гарбаты, а пасля ўбачыў, што мне не хапае бабла. У мяне засталіся толькі дзве кроны. Я чакаў, пакуль афіцыянт пойдзе з таго крыла, дзе я сядзеў, каб я мог праслізнуць да гардэроба і зматацца. Я пакінуў ім дзве кроны і зваліў. Іспыт быў нармальны. Пасля мы з Іванам ехалі стопам да Прагі (з Радаціна). Ніхто нас не браў, толькі нейкі фургон падкінуў нас да скрыжавання, а адтуль мы ўжо пачасалі на аўтобус да Прагі. Дома я пераапрануўся і пайшоў у “Маластранскую”. Там было супер. На шчасце, афіцыянткі былі бездакорныя. Адна мяне нават павіншавала, ну і ўсё такое. Там было шмат людзей, са мной здарыліся дробныя прыгоды кшталту:

Да мяне падышоў патлаты хлапец з шалёнымі вачыма:

“Здароў, закурыць не будзе?”

“Бяры,” – частую яго “спартай”.

“Дзякуй, я яшчэ адну вазьму. На дарогу,” – і зваліў.

Пасля мяне хтосьці запытаў, ці знаёмы я з гэтым патлатым.

“Не,” – кажу.

І г. д.

ПрайдзіСвет

Мы адсвяткавалі маю паспяховую здачу іспытаў, але не факт, што мяне возьмуць. Я сустрэў аднаго цудоўнага чалавека, з якім пазнаёміўся не так даўно. Яго завуць Мухамед, ён увесь зарослы і ходзіць на мыліцах. Ён чытаў некаторыя мае опусы, мы дамовіліся, што пойдзем, калі будзе цёпла, кудынебудзь у парк ды патрындзім пра ўсё. А сёння мы з Ваятам збіраемся ў бібліятэку на лекцыю пра імпрэсіяністаў.

Бабы са сваім каханнем хай ідуць у печ, яны мне здрадзілі.

Гэта ўсё. Усё. Я балдзею ад гэтага жыцця ў Празе. Прага, мой табе паклон, калі знайду час, напішу табе оду. Узяць вось хоць бы метро. Калі я ў метро, здаецца, яно робіць з людзьмі, што захоча. Так смешна, калі нечы голас кажа: “Канцавы прыпынак, калі ласка, пакіньце вагоны!” – і людзі, як авечкі, вылазяць з цягніка, горнуцца да эскалатараў і едуць на свет Божы. Ці яшчэ: “Грамадзянін у зялёным паліто, напрамак на вуліцу Леніна, адыдзіце ад краю платформы!” Ха-ха-ха-ха…




Лекцыя была супер, мяне так уразіла, што Ван Гог перад смерцю быў вымушаны прывязваць пэндзаль да пальцаў. А так мы ўсё недзе сядзім,

prajdzisvet.org

таўчэмся і боўтаемся, як валацугі. Зараз у мяне Квіда і Леанард. Я рады, што Квіда прыехаў, а Леанард – клёвы. А вось з Дастлі – жопа. Яму няма дзе начаваць, сёння спаў у Леанарда. Сёння пятніца, а значыць = Вольны шлях. Увечары іду слухаць джаз, але ад Леанарда я пачуў пра тусу ў Нуслях, дык цяпер не ведаю. Так ёсць, так было і так будзе. Калі мы будзем не ведаю што, усё адно ўсё майя, ці не? Бо ўсё толькі майя, пустое майя. Бррр…

Я заўсёды пісаў пад музыку, але цяпер мушу засяродзіцца, бо шмат усяго, не хачу ні пра што забыцца. Калі я толькі што пачаў ляпаць па клавішах, мне здалося, што гэты тарарам – такая прыгожая музыка. Учора (занатоўка пра Прагу) са школы рана прыехаў Квіда, чаму я страшэнна ўзрадаваўся, бо чакаў яго. Я прыхапіў з сабой “Yes”, і мы пайшлі да яго. Там мы селі (яшчэ і Леанард), ён заварыў гарбату, даў нам паперу і мы ўтрох пачалі тварыць. Маляваць. Гадзіны праз тры мы сабраліся і рушылі ў “Маластранскую”. Квіда застаўся дома, сказаў, што падыдзе пазней. Там былі Пэтра, Марта і Дастлі, каторы быў у гуморы. Пасля туды прываліла куча народу. Ізноў Злая Моркаўка тут як тут і г. д. Потым туды прыйшла Марго і сказала: “Зараз пайду да “Глаўбаў”, а пасля, відаць, павалю бухаць на адзін тусняк”. Гы-гы-гы – ідыёт. У мяне быў файны настрой, мы зноў збіраліся ісці слухаць джаз і г. д. Там са мной адбылася адна незвычайная гісторыя: туды прыйшоў адзін пацан, з якім мяне пазнаёміў Боршч. Яму магло быць гады дваццаць тры, такі рыжы, з вусамі і бародкай. Я запытаў яго пра кружэлку “Пластыкаў”[3], ці ён бы мне яе не прадаў, бо ў яго яна была. Ён сказаў, што ўжо, на жаль, прадаў іншаму.

Ён быў трохі пад мухай.

“Слухай, – кажа, – пайшлі пагаворым. Адзін на адзін”. Я пайшоў, бо чалавечыя лёсы, ці хутчэй, жыцці, абуджаюць ува мне інтарэс (у тым ліку дзякуючы кнізе). Мы прыселі за іншы столік.

“Слухай, ты ж цікавішся музыкай, праўда?” – пытаюся.

“Я пераважна люблю джаз. Негрыцянскі”.

“Гм, я бачыў, калі ты мне пазаўчора кружэлкі паказваў, амаль адны чорныя,” – кажу.

“У мяне дома такіх больш за васемсот набярэцца”. Гэта мяне нямала здзівіла, я запытаўся, дзе ён бярэ гэтыя кружэлкі. Высветлілася, што ён год вывучаў філасофію ў Швецыі і там у яго знаёмыя. А да таго ён працаваў графікам, скончыў Голарку[4], а з філасофскага факультэта яго вытурылі ў семдзесят сёмым. Пасля так трохі з запалам сказаў:

“Глянь, што ў мяне ёсць, фантастычную рэч дастаў”. Ён выцягнуў з торбы і падаў мне дзве прыгожыя кветкі (гравюры з дзвюма раслінамі). Яны былі проста фантастычныя, я не чакаў, што ўбачу штосьці падобнае. Я запытаў, чым яго такое цікавіць, а ён мне ў адказ: “Кветка – аснова выяўленчага мастацтва, яе абрысы і формы можна знайсці ў кожнай карціне”.

[3] The Plastic People of the Universe – легендарны чэшскі андэграўндавы гурт.
[4] Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая мастацкая школа імя Вацлава Голара.

Тады я яго спытаў, ці ён яшчэ працуе графікам. Ён сумна ўсміхнуўся і кажа:

“Ага, графікам… адзін тыдзень працую за Прагай, другі – тут, – ледзь не са слязьмі ў голасе, – самы лёгкі інструмент – пяцідзесяцікілаграмовы молат з жалезнай рукаяткай. Гэта называецца молат, але насамрэч гэта кабан. Гэтае жалеза там для таго, каб молат, калі я яго падымаю, не пераламіўся. Зарабляю восем штук, але ўсё ідзе вось на гэтую дурасць,” – і паказвае на гравюры. А пасля дадае: “Але гэта не дурасць...” – і пагладзіў гравюры даланёй.

“Глядзі,” – кажа і паказвае мне свае далоні. Яны былі мазолістыя, са слядамі запечанай крыві. Я ледзь не разрумзаўся. Вось ёсць жа людзі – і так вымушаныя жыць. Ды яшчэ, акрамя ўсяго, ён шукаў тры кроны, каб заплаціць за каву, якую замовіў, бо ў кішэнях свістаў вецер. Пасля яго ахапіла нейкая злосць ці што, ён пачаў крычаць, што вакол адны дурні, і кляў гэты свет. Альбо там быў іншы хлопец прыблізна такога ж веку, як гэты, які на штрыфелі пінжака насіў скаўцкі значак.

Я спытаў яго, ці ён скаўт. “Цяпер ужо не, але калісьці быў; цяпер ужо проста гэтым правакую”.

“І як табе было ў скаўтах? – запытаўся я. – Я таксама быў скаўтам, але завадатар у нас быў тупы, дык я кінуў”.

“Ну, у мяне завадатарам быў мой бацька, таму нармальна,” – кажа ён. Пасля я яшчэ спытаў, ці пойдзе ён з намі паслухаць джаз, але ён адказаў, што ў яго іншыя планы. Так усё і скончылася.

Мы выйшлі з кавярні і ніяк не маглі дамовіцца, як і што. Урэшце я раззлаваўся, бо ўсе хацелі пайсці нажэрціся, жывёлы, я адступіў ад іх на некалькі крокаў і абвясціў, што той, хто хоча ісці слухаць джаз, хай падыдзе да мяне. Да мяне далучыліся толькі Квіда, Марта, Пэтра і Мірык.

Яшчэ туды меўся прыйсці Ваят з Бланкай. Таму як да пачатку быў час, мы пайшлі наверх па Нэрудавай, і ў мяне сапсаваўся настрой. Я сапраўды хацеў, каб у мяне быў дрэнны настрой, каб Марта бачыла гэта. Між іншым, сваім кепскім настроем я хутка заразіў і Квіда. Мы корпаліся ў жалезным ламаччы, раскіданым па кустах, на Пэтршыне можна знайсці класныя рэчы. Мы ішлі па сцяжынцы, на якой ціхарацца педзікі, і я пачаў дэкламаваць тэкст, напісаны братам. Здаецца, неяк так:

*Дожджык, дожджык, секані,*
*Мы паедзем на кані.*
*Запрагай, мой дарагі,*
*Пару коней вараных,*
*Мы паскачам праз лугі,*
*Мы паскачам праз імхі.*
*Мая мілая, скажы, што за дзіўны смех такі,*
*Не хвалюйся, дарагі, гэта жабы ля ракі…*

Верш яшчэ не скончаны, але гучыць класна. Я Ёзэфам проста захапляюся. Дождж ішоў як з цэбра, дык мы развярнуліся да “Рыхты”. Джаз мяне ўжо так не кранаў, але там усё роўна было па-ранейшаму супер. Там быў і Ёзэф з Бэрэніс. У перапынку мне захацелася пайграць. Каб я сеў за фартэпіяна, а Квіда за бубны. Я прапанаваў яму, але ён не згадзіўся: настрой у яго быў паганы. Я ўпрошваў яго чвэрць гадзіны, пакуль ён урэшце не сказаў, што пастукае, але толькі тады, калі ўсё скончыцца і ўсе разыдуцца. Пасля народ пачаў разбягацца, з нашых засталіся толькі мы ўдвух. Калі музыкі скончылі граць, я пайшоў папрасіцца, але нічога не выйшла, бо ў музыкаў быў час толькі да адзінаццаці, а за кожную наступную гадзіну яны б вымушаныя былі даплочваць семдзесят крон. Дома рабілася штосьці неверагоднае, а ўсё таму, што я прыйшоў позна. Назаўтра, я толькі апрануцца і паспеў, чую з вуліцы свіст. Выглянуў, бачу – Леанард, Дастлі і яшчэ адзін славацкі нефер. Я ўсё роўна якраз збіраўся да Квіда, таму ўзяў “The Doors” (абяцаў даць Квіда паслухаць) і вылез праз акно на вуліцу. Яны спрабавалі спакусіць мяне пайсці ў “Рубін”, але я пайшоў да Квіда, а наконт Дастлі я і цяпер не ўпэўнены. Але на Мостэцкай я якраз спаткаў Квіда, ён ішоў да нас. Той, калі пачуў пра тусоўку ў “Рубіне”, пайшоў са мной. У прынцыпе, мне там спадабалася. У перапынку я граў на фартэпіяна, бо Дастлі хацеў пачуць, як я граю, а заадно і яшчэ некаторыя. Дзесьці а палове на другую я сабраўся і пайшоў дадому абедаць. Дома мне давялося доўга ўгаворваць продкаў, каб мне дазволілі яшчэ выйсці. Пасля абеду я зноў паляцеў у “Рубін”, сустрэў Ёзэфа і Марціна. Забраў іх з сабой і мы пайшлі ўтрох. Калі мы туды прыйшлі, усё ўжо, на жаль, скончвалася. Брат пайшоў дадому, а я з Марцінам пачакаў хлопцаў. Мы пайшлі да Квіда, я страшэнна радаваўся, бо па дарозе мы натыкнуліся на Мухамеда. Ён, злосны-злосны, хадзіў па Мостэцкай і шукаў, чаго б з’есці. Я запрасіў яго да Квіда. Ён пачыкільгаў за намі па прыступках. Зайшоў у цёплы пакой і гаворыць: “Тут так цёпла, як пад бокам у соннай маці”. Мне не хочацца, каб вы падумалі, што ён грае на публіку. У яго гэта ад прыроды. На стале стаялі дзве міскі, з апельсінамі і з печывам. Ён кінуўся на іх, пачаў усё цалаваць, нешта там мармытаў, ён проста быў, і быў жывёлай, істотай па-за класіфікацыямі, быў усім, быў створаны Богам. Гэта было так прыгожа, Квіда прынёс на стол яшчэ шмат усяго: хлеб, масла, ёгурты і тварожныя дэсерты, кілбасу, рознай гарбаты. Я назіраў за Мухамедам, як ён, перш чым пакласці ў рот чарговы кавалак, цалаваў яго. А ягоныя пальцы бегалі па стале, быццам па фартэпіяна. Ён супакойваўся і зноў шалеў. І апраўдваўся, што сёння ўсе ягоныя думкі і словы папераблытваліся і можа быць альбо цішыня, альбо крык, а яшчэ лепш скрыгатанне. Мы слухалі шмат рознай музыкі, а пасля яшчэ Баха, было здорава. Мухамед прыгожа гаварыў. Пра Польшчу, пра мову, пра свае незвычайныя прыгоды.

Адна мяне ледзь не да слёз расчуліла.

Аднойчы ён ішоў лесам і пачуў страшэнны енк. Енк, у якім перамяшаліся боль, трохі сілы і злосць. Але найбольш было менавіта болю. Калі Мухамед выйшаў на паляну, убачыў цыгана. Той падышоў да яго і кажа: “Хачу напіцца”. А Мухамед у адказ толькі: “Пайшлі”. Яны ішлі доўга, цыган кідаў на Мухмеда злыя позіркі, а пасля кажа: “Калі яшчэ доўга, то цябе можа не стаць, мой гаджа”. Па-цыганску “гаджа” азначае “дарагі сябра”. Потым яны прыйшлі ў маленечкую вёсачку да нейкага Мухамедавага сябра. Але ў таго нічога не было, ён пабег да дзеда і прынёс некалькі бутэлек самагонкі. Мухамед з цыганом селі за стол і пачалі піць. Яму страшэнна карцела ведаць, што ў гэтага цыгана здарылася, але першым ён не пытаўся. Ён мне сказаў, што цыганоў крык гучаў так, быццам калі жанчына, якую кахаеш, скажа ціха, але цвёрда: “Я цябе не кахаю,” – і пойдзе сваёй дарогай. Так яны моўчкі і пілі. Урэшце цыган са слязьмі на вачах узяў галаву Мухамеда ў свае далоні, паглядеў яму ў вочы, пацалаваў у лоб і пайшоў…

На жаль, я не ўмею так прыгожа ўсё распісаць, як Мухамед. Той гаворыць, як па кнізе чытае. Потым мы слухалі Берлёза, выпілі тоны гарбаты і паляглі на падлогу. Нам усім (то бок мне, Сайману = славаку і Квіда) здавалася, быццам мы адна сям’я. Гэта было так класна. Пасля я пайшоў. Дастлі быў у гуморы, але трохі мне дакучаў, што мяне няслаба выводзіла. Але было прыкольна. Потым я пайшоў дадому. Павячэраць. І змог упрасіць маму, каб яна дазволіла мне яшчэ выйсці. Я захапіў з сабой кружэлку Немэна, на якой ён так прыгожа кажа “а Сакрат” (Мухамед хацеў гэта чуць). Я спадзяваўся, што яны яшчэ будуць у Квіда, але яны, на жаль, ужо былі ў кавярні. Туды мне не надта хацелася, але што зробіш. Я пайшоў туды, каб падбіць іх адразу ж зваліць, але яны хацелі застацца яшчэ хоць на паўгадзіны. Тады я сеў у самым канцы за крайні столік, адзін, выняў асадку і напісаў верш пра пагібель чалавека, якога знішчылі звяры. Я прысвяціў яго Мухамеду, бо ў пэўнай ступені ён быў напісаны пад ягоным уплывам. Я сабе нічога не замаўляў, і неўзабаве мы зноў пайшлі да Квіда. Я паставіў Мухамеду Немэна, ён пранікся. Пасля я паставіў сапраўднае мяса і пачаў танчыць. Мухамед скакаў на ложку, вылупіўшы вочы, і гарлаў вершы, якія ў яго праносіліся ў галаве. Шмат трындзяжу і народу + гарбаты + нікатыну + музыкі. І ўсё за адзін вечар. Мухамед – прарок, я ад яго фігею. Але шкада, што ўсё гэтыя людзі зломленыя.

На вуліцы – такая прыгажосць! Сонца свеціць, так цёпла, светла. Кайф. Марцэла на мяне забіла. Я кахаю яе, а яна з Хамелеонам. Прыйшоў Вялікдзень (з вялікім К?). Сёння якраз субота. Учора я пасціўся. Ад пазаўчора нічога не еў. У школе ў мяне быў крызіс голаду. Пасля ўсё нармалізавалася. Я прыйшоў са школы, закурыў і капітальна загрузіўся. А ўчора прыходзіў Сайман, дакладней, я яго да нас зацягнуў. Ён файны. Ягоныя бацькі жывуць у Кошыцах, а тут ён вучыцца на графіка, у Геліхаўцы. Жыве ў адным склепе ў Нуслях, дакладней, гэта не склеп, а былая фотамайстэрня, там праяўлялі фоткі. Ён расказаў, што калі ў іх побач збіралі

металалом, ён перад домам знайшоў ложак. Нехта выкінуў. Дзіцячы ложак. Ён хутчэй прыцягнуў яго да сябе, бо да таго ў яго ўвогуле ніякага не было. Выдраў спінкі, каб можна было ногі выцягнуць, а пасля даведаўся, што ў гэтым ложку памёр суседскі хлапчук. Але ён і цяпер у ім спіць. А са сваімі суседзямі ён пазнаёміўся так: аднойчы ён спаў, і тут нехта дзіка загрукатаў у дзверы. Заспаны, ён пайшоў адчыніць, да яго заляцеў пацан гадоў пятнаццаці, крычыць, кліча на дапамогу, маўляў, там сын б’е свайго айчыма. Ён і вокам не міргнуў (Сайман), апрануўся і пайшоў з тым хлопцам. Яны прыйшлі да суседзяў, і ён убачыў, як дванаццацігадовы хлопец малоціць на чым свет стаіць свайго айчыма. Ён, Сайман, такі ціхі, маўчыць, не гаворыць нічога, але мне, калі ён быў у нас, удалося яго разгаварыць. Ён прыгожа гаворыць пра Хрыста, Дастаеўскага і Гогаля. Ён разумны і ўвогуле супер. Яшчэ і фатаграфуе…

Увечары, пасля музыкалкі, мелася прыйсці Марцэла. Ясны пень, не прыйшла. З галадухі ў мяне зводзіла жывот, і я думаў пра Хрыста. Пайшоў у кавярню, піў толькі тонік ды гарбату. Там было досыць шмат народу. Я пазнаёміўся з адным галандцам. Яго завуць Ёганэс, але мы яго называем проста Ган. Так карацей. Ён тут вучыцца на географа. У Браціславе, ва ўніверы Коменскага. Нармальна так гаворыць па-славацку, дык мы змаглі пагутарыць. Ну і яшчэ дзякуй ангельскай і мове жэстаў. Мы чакалі, пакуль прыйдзе Квіда. Прыйшоў досыць позна. Мы ненадоўга заскочылі да яго. Злая Моркаўка мяне ўжо страшэнна бесіць. Голад. Я пра гэта нікому не казаў, але калі мы былі ў Квіда, я быў зусім ніякі праз Марцэлу, і я сядзеў на зямлі, і маліўся Хрысту. На каленях ляжала кніга Бішапа, “Апошні дзень Ісуса Хрыста”, у руцэ крыжык, і надзея. Раптоўна ўсё знікла, і быццам скрозь туман я ўбачыў вялікую тоўстую літару Т. Крыж, вылупленыя вочы, голад, маленне ў касцёле св. Якуба, Ісус, бічаванне і ўкрыжаванне. Усё гэта я ўбачыў у той відзежы. Гм… Пасля мы звалілі. Квіда надумаў пайсці паслухаць джаз. Ган мусіў вяртацца ў інтэрнат. Не ведаю, куды падалася Злая Моркаўка. Хамелеон з Марцэлай (о Божа!). Мухамед некуды знік, а Ёзэф, той увогуле быў чорт ведае дзе. Квіда і яшчэ пару чалавек пайшлі ў “Рыхту”, а я папёрся дадому спытаць, ці можна мне разам з імі. Мне дазволілі, і я паляцеў назад. На Маластранскай убачыў Ваята з Бланкай і Гана. Я іх загітаваў і мы павалілі ў “Рыхту”. У “Нэрудаўцы” – п’яны Ёзэф з Бэрэніс. Ідзем. Вось ужо сядзім у залі. Джаз аблізвае нас сваімі трапнымі языкамі. Гану захацелася піва. Мы ўсталі і пабеглі ў бар. У “Рыхту”. Просім піва, дакладней, ён. А нам кажуць, маўляў, вам яшчэ васемнаццаці няма, валіце адсюль. Прытым Гану ўжо дваццаць тры. Я ім кажу пра гэта, а таксама, што ён замежнік. А яны яму: “Пакажаш пашпарт або пасведчанне, тады будзе і піва”. Ган доўга рагатаў. А мы ўжо бяжым да “Банапарта”, дзе нам таксама паказваюць на дзверы, няма вольных месцаў. Ган рагоча, мы валім у “Сонцы” – зачынена, да “Катоў” – зачынена, да “Брабанта” – таксама, да “Палцата” – там піва няма, тады купляем пляшку віна і ідзем назад. Мы з Ганам абмяняліся адрасамі. Ён

проста фантастычны. Зараз да яго прыязджае з Галандыі тата, дык тыдзень да нас не зможа. Шкада, заўтра мог бы пайсці з намі ў “Люцэрну”, на рок-н-рольны Вялікдзень. Я ўжо чакаю. Марцэла (нягледзячы на маё каханне) паслала мяне, дык заўтра пашукаю там сабе якую-небудзь класную дзеўку. Хай мне Бог дапаможа! Але ж я яе кахаю…

Ад рок-н-рольнага Вялікадня я проста ашалеў! Гэта было здорава. Там гралі “Blusberry” і яшчэ нейкія гурты, але “Blusberry” – самыя крутыя. Канцэрт быў з трох да васьмі. Пяць гадзін музыкі, пяць гадзін бясконцага слэму ў “Люцэрне”, пяць патоў, пяць цыгарэт, пяць гадзінаў жыцця. Назаўтра пасля гэтых танцаў было цяжка паварушыцца. А яшчэ там са мной адбылася такая сумна+цудоўная прыгода. Калі мы з Пэтрам урэшце вырашылі, што падклеім якіх-небудзь баб (паляванне, аднак, было няўдалым!) (на жаль), мы прыселі за столік, за якім сядзелі чатыры дзеўкі, такія ж, як і мы. Тая, што апынулася побач, мне спадабалася. Было прыкольна, калі яны спрабавалі адгадаць, колькі нам гадоў. Пэтру давалі шаснаццацаь–семнаццаць, але і мне таксама. Дзіка прыкольна, але колькі мне напраўду, я ім лепш не сказаў, бо тады б усё скончылася ў адно імгненне. Зрэшты, і так хутка ўсяму прыйшоў канец, хоць спачатку ішло як на мазаных колах. “Сваёй” я за апошнія, да таго ж пазычаныя, грошы, купіў буцік, мы пілі з ёй віно (ейнае ці, хутчэй, іхнае) і г. д. А потым я забалбатаўся з Квіда, а яны ўзялі ды ўцяклі. Чортаў лёс! Але мне больш смешна, чым шкада. Яшчэ я пазнёміўся там з адным чалавекам. А было ўсё так:

Мы з Сайманам яшчэ перад канцэртам сядзелі ў кавярні насупраць. Тут да мяне падвальвае нейкі пацан, гадоў, можа, трохі за дваццаць, і кажа:

“Здароў, Патрык”.

Я вырачыўся на яго як баран і кажу, што мы незнаёмыя. А ён мне:

“Гм, я ведаю твайго бацьку, жыву на Нэрудавай. Мяне завуць…”

“Ты Пэпа Янічак?” – перабіваю яго, бо гэты хлопец нагадаў мне Пэпу.

“Ха, не, я Пастамент. Я памятаю, як ты быў малы і насіў ключ на шыі”.

Тут я яго ўспомніў, бо тата аднойчы мне пра яго расказваў. А ўспомніў, калі ён сказаў, што жыве на Нэрудавай. Тата яшчэ казаў, быццам ён любіць “Rolling Stones”. Я спытаў, ці праўда, і ён пацвердзіў, што так. Тады я пераканаўся, што ён не шпег, ён мне спадабаўся. Ён там быў яшчэ з двума патлатымі, яны таксама ішлі на канцэрт. У “Люцэрне” сапраўды было супер. Пасля канцэрту ўсе павалілі тусіць далей. Мы таксама. Нас было шмат. Спачатку хацелі заваліць у які-небудзь бар, але ўсё было зачынена. У Ваята нікога не было, мы кідалі яму ў вокны каменьчыкі. Ніхто не адгукнуўся. Мярзотнік. Учора я ад яго даведаўся, што яны з Бланкай былі ў нейкім начным гатэлі ў Доксах. Урэшце мы завіслі ў Квіда. Забыўся сказаць, што за дзень да канцэрту прыехалі хлопцы з Плзэні. Яны нейкія такія… Не ведаю, як сказаць. Адзін, напрыклад, калі мы былі ў Квіда, хацеў бутэлькавае піва. Зажымаў цыгарэты. Ну і г. д. Але ў цэлым нармальныя.

Учора мы былі ў Саймана. Ну і флэт! Гэта дзесьці ў Нуслях, у такіх задрыпаных дамах, давялося лезці праз дзіркі ў плоце, пералазіць цераз мур, вось так… На абадраных дзвярах алоўкам напісана яго імя. “Кватэра” – гэта мініпіздрычная вітальня і такі ж малюпасенькі пакойчык. Там у яго два ложкі (адзін застаўся ў спадчыну ад памерлага хлопчыка, паходжанне другога мне невядомае). Мы выцягнулі віно, праз хвіліну з-за дыму нічога не было відаць, я дастаў “Анатомію” Зрзавага[5], быў п’яны, чытаў уголас пра будову мужчынскіх і жаночых палавых органаў. Было ржачна і ў той жа час брыдка. Усе слухалі з разяўленымі ратамі, супер. Я вінен Сайману бохан хлеба. Сёння сустракаюся з Мухамедам. Возьмем свае рэчы і пойдзем некуды ў парк медытаваць. Чакаю. Шкада, што нядзеля, а то маглі б купіць ружовенькага, ну так, для настрою. Хоць не, лепш так, а то нажэрліся б, як свінні.

Пастамент, МАГЧЫМА, дастане мне марыхуаны. Зараз ён збіраецца яе пасеяць, а потым, як ужо будзе, то дасць мне. Бацька Гана паехаў, але прыехала ягоная дзяўчына Элен. На жаль, яна гаворыць толькі па-галандску і па-ангельску. Яны клёвыя. Спачатку яны былі ў нас, а потым мы разам пайшлі да “Палцата”. Мы там нарагаталіся, паказвалі адно аднаму фокусы. Пасля ўжо пачалі рагатаць абы з чаго, з рознай лухты, якую самі ж і прыдумлялі. Было здорава. Сёння яны зноў збіраліся прыйсці. Мне абяцалі даць кружэлку “The Plastic People of the Universe”, яны іх таксама хочуць паслухаць. У панядзелак – Першамай, у школу ісці не трэба. У аўторак зноў выходны, і я ўрэшце ўгаварыў маму, каб дазволіла мне паехаць да Леанарда на Вальпургіеву ноч. Ён жыве ў Чарнашыцах. Едзем усе. Гэта будзе незабыўна. Жыццё. Не магу дачакацца. Толькі шкада, што з дзеўкамі мне не шанцуе. Усе кажуць, маўляў, малы яшчэ, пачакай год-другі, а пасля ўсё прыйдзе, але ж як мне так доўга трываць?

Ах-ха-ха-г-г-гы-чха. Так я рагачу, калі ўзгадваю вечарыну ў Данека, дзе мы былі. Я на хвіліну зайшоў у кавярню, там было досыць шмат людзей. Пасля прыйшоў брат і пацягнуў нас з сабой на тую вечарыну. Ган не хацеў, але мы ўсё-ткі пайшлі. Ёзэф не ведаў дакладна, дзе гэта. Недзе ў Інаніцах. Данек – ягоны аднакласнік, маўляў, страшэнны дэбіл. Ішоў дождж. Мы доўга шукалі, пыталіся, урэшце знайшлі. Нас было адзінаццаць чалавек. Уяўляю, які ў гаспадара мусіў быць шок, калі мы завалілі туды ўсёй шоблай на чале з Баршчом. Смех дый годзе. Іх там сядзела, здаецца, пяцёра. Забіліся ў кут і слухалі “Beatles”. У Данека на сценах віселі абгорткі ад французскіх сыроў, нейкая парнуха і Вінэту. Мы ўсіх там разварушылі. Да лямпы быў прычэплены чэрап. Ёзэф, як ішоў, выпадкова зачапіў лямпу, і чэрап расшчапіўся на дзве часткі. Роланд адчыніў акно, ля сцяны былі шклянкі, якія не без удзелу Роланда таксама пачалі звінець. Данек шалеў. Мы ўзнялі страшэнны вэрхал. Сайман хацеў есці, я завёў яго на кухню, і мы пачалі шукаць, што б кінуць на зуб. Знайшлі толькі печаныя каштаны. Я ўзяў адзін і пайшоў у прыбіральню. Адзінае, што мне за ўвесь вечар спадабалася, дык

[5] Класічны падручнік анатоміі для мастакоў, напісаны праф. Ёзэфам Зрзавым.

гэта тая хвілінка ў сарціры. Каштан быў вельмі цвёрды, і калі я мачыўся і пры гэтым неміласэрдна яго грыз, дык хрумканне прыгожа разносілася па памяшканні. Пасля адбылася адна незвычайная размова (гэта быў прыкол):

Я на хвілінку прысеў у вітальні, і ў гэты момант з пакою выйшла нейкая дзяўчына. Досыць прыгожая. Збіралася ісці дадому. Яна абувалася ля дзвярэй, а я сядзеў ля сцяны за рогам, і таму мы адно аднаго не бачылі.

Я пачаў першы.

Кажу:

“Ужо ідзеш?”

Яна:

“Гм”.

Я:

“А чаго?”

Яна:

“Нецікава тут”.

Я:

“А што для цябе значыць цікава?”

Яна:

“Ну, проста тут нецікава, не ведаю…”

Я:

“Дык а што для цябе цікава?”

Яна памаўчала хвіліну, а пасля моўчкі пайшла. Калі бразнулі дзверы, я разрагатаўся. Азін Ёзэфаў аднакласнік, нармальны, у прынцыпе, хлопец, памылкова адкаркаваў віно Данекавай маці. Тут ужо Данек не вытрымаў і выкінуў нас.

Тыдзень прайшоў добра. Неяк я сядзеў у кавярні, і тут прыходзіць брат і дае мне пачак запалак. Я адкрыў – і закрычаў ад радасці, бо ўнутры – квіток у клуб на “Сунічную пракламацыю”. Я яшчэ яе не бачыў, але шмат чуў, таму чакаў з нецярплівасцю. Было проста класна. Адзін з найлепшых фільмаў, які я калі бачыў. А канец! Ужо з сярэдзіны фільму мяне пачало трэсці, але я трываў і не расплакаўся. Аднак як толькі выйшаў з кінатэатра, на мяне накаціла – і я страшэнна разрумзаўся.

А потым прыйшоў Вялікі Дзень, вольны панядзелак, калі мы збіраліся ехаць на Вальпургіеву ноч у Чарнашыцы. Але пачну з пачатку. Мы дамовіліся сустрэцца каля дзесятай перад кавярняй (раніцай). Яшчэ перад гэтым я забег да Квіда, які спачатку думаў ехаць пасля абеду з Ёзэфам, але я пацягнуў яго з сабой. За дзень да гэтага да яго прыехалі знаёмыя, хлопец і дзяўчына з Плзэні. З намі яны не схацелі (шкада), таму засталіся ў Квіда, а калі вырашаць зваліць, то пакінуць ключ у дамоўленым месцы. Пасля яны там пакінулі для нас запіску, якую напісалі марзянкай, вар’яты. Мы з Квіда прыйшлі, але перад кавярняй нікога не было. Унутры сядзела Пэтра, якая цэлы дзень была не ў сваёй талерцы, таксама Робін, Маркета і Дастлі. Наконт яго ў нас цяпер вялікія сумневы. Міцка па-любому не можа быць шпегам, бо

мы не бачыліся ўжо амаль тры месяцы. Але яму даравальна. А Дастлі… Пра яго мы нічога не ведаем – ці ён быў у войску, ці ёсць у яго кватэра, дзе ён цяпер жыве і чым займаецца. Але гэта толькі здагадкі. І ўсё адно, нават калі ён не іхны агент, мне ён усё роўна ўжо дзіка не падабаецца. Ну і ягоная бісэксуальнасць зноў тырчыць з усіх дзірак. Праз гэта мы з ім ужо некалькі разоў трохі пасраліся. Дык мы цяпер не ведалі, як так зрабіць, каб Дастлі не паехаў з намі ў Чарнашыцы, бо не падабаецца ён не толькі мне. Мы ўсе пасталі на прыпынку і чакалі, калі прыедзе дванаццаты трамвай. Пасля Дастлі яшчэ на хвіліну заскочыў у кавярню, а мы скарысталіся гэтым і ўцяклі ад яго на Уезд пешкам. Гэта жорстка, але жыццё такое. (Я дрэнь?) Тут прыехаў дванаццаты, мы зайшлі, і адбылося тое, чаго мы баяліся. У трамваі быў Дастлі. Мы збіліся ля ўваходу ў кучу і на наступным прыпынку перабеглі ў другі вагон. Дастлі не звяртаў на нас увагі, але ж усё бачыў. Ля Сміхаўскага вакзала ўзняўся вэрхал. Маркета і Робін спрачаліся, ці варта ехаць стопам, але выйшлі. Пасля ўсё роўна паехалі стопам. Дастлі паехаў на цягніку. (І гэта бітнік… Але што з яго ўзяць?) Мы з Квіда і з Пэтрай вылезлі ля спіртзавода на Зліхаве, свет зноў зрабіўся цудоўны. Квіда з Пэтрай стопілі разам (ён трохі не ў духу, апошнім часам у яго да дзевак нейкая антыпатыя), а я адзін. Я нават пяці хвілінаў не стопіў, гляджу – Ваят з бацькамі едзе на лецішча на Збраслаў (Ваят збіраўся прыехаць у Чарнашыцы вечарам). Яны падкінулі мяне да павароту на Радацін, а самі паехалі ў кірунку Збраслава. Вецер быў досыць моцны, але мне гэта нават падабалася. Я закурыў цыгарэту, якую хітрамудра хаваў, калі махаў спадарожным машынам. Побач на траве сядзела нейкая дзяўчына. Потым на ровары прыехаў хлопец, і яны паехалі, кідаючы адно на аднаго закаханыя позіркі… Нават пяці хвілін пастаяць не давялося, як да скрыжавання пад’ехала таксі, і з яго выскачылі Квіда і Пэтра. Яны не заплацілі, кіроўца ўзяў іх проста так. Цяпер мы памяняліся. Пэтра стопіла асобна, а я – з Квіда. Пэтру ўзялі адразу, а мы праз пэўны час спынілі нейкага вар’ята, які ехаў на такой шалёнай хуткасці, што я ў жываце адчуваў халадок. Ну, вы ўяўляеце, як гэта бывае. Ён давёз нас толькі да Радаціна. Мы дамаўляліся, што Пэтра будзе чакаць нас на вакзале ў Чарнашыцах, часу было яшчэ шмат, а таму мы з Квіда пайшлі ў мясцовую забягалаўку пахлябаць супу. А пасля пашыбавалі пешкам да Чарнашыц. Гэта было цудоўна. Мы ішлі супраць ветру, які няслаба так дзьмуў, я цягнуў спальнік, мне было халодна. Квіда ішоў, загарнуўшыся ў коўдру. Мы на ўсё горла спявалі “Jesus Christ Superstar”. Валеты ў машынах, якія праязджалі міма, глядзелі на нас як тупыя бараны, а мы ішлі сабе, гарланілі песні “Bee Gees”, было здорава. А яшчэ гэты шалёны вецер, што неміласэрна на нас навальваўся і кідаў у морду прыгаршчы дажджу. Ну і цыгарэтны дым, і песні. Пэтра чакала нас на вакзале ўжо амаль гадзіну. Калі мы ішлі да дому Леанарда, дык убачылі за сабой Роя з гітарай, Саймана і Мухамеда на крылах. Калі мы збіраліся, гэта быў сапраўдны катарсіс. На жаль, у Мухамеда была тэмпература. У Леанарда ўжо сядзелі Марцін з Аліцыяй і

Дастлі. Мы сабраліся ў адным пакоі, і тут нечакана, быццам з неба, з’явілася цёплая гарбата з печывам, што якраз было ў тэму. Тым, хто быў галодны, я аддаў свой хлеб з кілбасой. Мы гралі на гітары і на флейце і проста трындзелі. Пасля Дастлі запытаўся:

“Што гэта было такое ў трамваі, а, Пат?” Гаворыць ён так, значыцца, а мне ўжо і ягоная манера гаварыць колам стаіць. Я яму адказваю:

“А што, мы не можам перабягаць з аднаго трамвая ў другі?”

“Ды можаце, але ведаеш, Пат, гэта…” І яго панесла. Я яго нават не слухаў, а ўзяўся гуляць з Сайманам і Роем у кубікі. Мы гулялі на бохан хлеба, але яны часта выйгравалі, дык я адмовіўся. Мы гаварылі па-славацку, гэта было так прыкольна. Я афігенна нарагатаўся. Квіда ў нейкай каморы маляваў кветачкі, Мухамед спаў, а так мы размаўлялі. Пасля мы пайшлі на двор. Перад гэтым пазванілі Баршчу, які сядзеў у мясцовым бары і чакаў нас. Мы падабралі класнага ньюфаўндленда, якога завуць Альф, і пайшлі. У бары сядзелі Робін, Маркета і Боршч з сябрамі. Боршч і кампанія былі ўжо добра залітыя. Мы забралі іх і пайшлі на нейкую спортпляцоўку. Праз Бэроўнку пераходзілі па мосце. Квіда і Рой жартам хацелі скінуць мяне ў раку, а калі я бараніўся і супраціўляўся, то парваў штаны. Праз дзірку разам з сінімі майткамі свяціўся мой зад, а гэтыя два прыдуркі рагаталі, як коні. Урэшце я таксама разрагатаўся. Дарога, па якой мы ішлі, была гразкая, Рой, як смяяўся, дык зрабіў віртуознае сальта, і ягоныя штаны таксама зазналі шкоду. Уся яго левая нага змяніла колер, стала такой ліпкай, карычневай… Цяпер мог смяяцца я. Месіва пад нагамі было вельмі слізкае, калі мы паварочвалі на пляцоўку, яшчэ аднаму спадабалася качацца па зямлі-матухне. Гэта быў сябар Баршча. Ён паслізнуўся, паваліўся на спіну і пляснуўся галавой у лужыну. Сяброўка пачала яго падымаць, але ён ёй зусім не дапамагаў, дык яшчэ разы тры ляснуўся. Мне ён нагадваў яйка, абвалянае ў муцэ. Калі ішоў, здавалася, быццам ён удзельнічаў у мотакросе, што канстатавалі Квіда і вонкавы выгляд пацярпелага. Са мной здарылася яшчэ адна тупая прыгода. На пляцоўцы стаялі перагорнутыя вароты, я разагнаўся і скочыў на сетку. Сетка не вытрымала, дык я яшчэ раз пабіў сваё і без таго ўжо пашкоджанае мяккае месца. Пасля мы пайшлі на вакзал. Павінен быў прыехаць цягнік, мы меркавалі, што на гэтым цягніку прыедзе мой брат. Карацей, мы былі такой прывітальнай камандай. Калі цягнік прыцягнуўся да платформы, з яго выскачылі Ёзэф, Ган, Бэрэніс і Сара. Мы пайшлі дадому, але толькі да саду, а потым перасунуліся да вогнішча. Мухамеду стала яшчэ горш, таму Леанардаў бацька адвёз яго на машыне ў Прагу. Леанардавы бацькі ўвогуле былі супер, за гэта ім ад усіх нас дзякуй. Пайшоў дождж, я гутарыў з Ганам, час ад часу нехта ныраў у гразь на дарозе. Вогнішча гарэць не хацела, мы стаялі побач і проста чакалі, пакуль яно датлее. Квіда і Ёзэф падазрона надоўга дзесьці затрымаліся, але хутка яны з’явіліся на гарызонце і няцвёрдай хадой з дзіўнымі выкрыкамі набліжаліся да нас. У руках у іх была нейкая бутэлька, з якой яны час ад часу рабілі па глытку. Мы з Роем

вырашылі на іх напасці: пабеглі да іх, але яны развярнуліся і, хістаючыся, пачасалі ў адваротны бок. Яны беглі як п’яны сцыць, але мы іх дагналі і выпілі апошнюю кроплю, якая ў іх заставалася на дне. Мы былі наскрозь мокрыя, таму пайшлі назад. Гэта быў прыкол. Калі мы стаялі ля “вогнішча”, на гарызонце з’явіліся яшчэ тры паставы – Хамелеон, Дуб, Улажан, а з імі яшчэ Хрыстыян. На дарозе да дому было клёва. Ёзэф скочваўся з нейкага пагорку, дык я яго выцягваў. Мы жудасна гарлалі ўсялякае абы-што. Мы з Роем насунулі на галовы коўдру, каб не змокнуць. Там была невялікая пясчаная гара, у якой быў нейкі лаз. Мы залезлі туды і спявалі. Пасля туды яшчэ ўскочыў Ёзэф, мы выглядалі як клубок чалавечых целаў. Мы ішлі і спявалі пра “трох малойцаў”. Ган падхапіў мелодыю і спяваў з намі па-галандску. Па дарозе мы сустрэлі Лукаша, які ходзіць з братам у школу, і яшчэ пару іх аднакласнікаў. Нас стала каля трыццаці. Леанард прынёс наверх такі файны грамафон, і мы скакалі, гоцалі, размаўлялі, малацілі рукамі ў паветры, як быццам гралі на бубнах, пілі, смяяліся, любілі і г. д. Пасля раптоўна з’явіліся Ваят з Бланкай, і тут пачалося… Абаіх заабдымалі, мне падаецца, што нават Альф у гэтым паўдзельнічаў. У нас было пятнаццаць пляшак віна, вядро піва, і магу пахваліцца, што я выпіў толькі дзве шклянкі віна. Гэты гармідар мне ўжо пакрысе пачынаў лезці на нервы, таму я пайшоў прылегчы ў цёмны пакой, дзе звычайна праяўлялі стужкі. Я ляжаў на падлозе, усё было, у прынцыпе, нармальна, але ўвесь час мне нехта перашкаджаў: заходзілі, уключалі святло, выключалі. Я пайшоў на гарышча, там былі два ложкі. Я ўзяў гітару і пачаў граць. Пасля я прывёў туды Квіда і Ваята з Бланкай. Затым туды прыйшоў Рой, мы гралі рок-н-рол. Я спяваў па-расейску: “Я мышонак, ты харёк, я зверёк і ты зверёк”. Было клёва. Сара пасля таксама прыйшла. Леанардаў бацька быў малайчына, прыносіў нам гарбату, фантастычны чалавек. Яшчэ раз дзякую яму. Раптам адчыняюцца дзверы, гляджу: а хто там ідзе? А нікога, толькі гармідар і рагатанне. Гляджу на падлогу, а там поўзае Ёзэф. Ён увесь час поўзаў і раз нават з’ехаў па прыступках. Прыйшла Бэрэніс, нас тут стала зашмат, таму я зваліў, але я зноў быў у гуморы. Было здорава, мы пілі, танчылі, паўсюль была музыка. Дзесьці бліжэй да адзінаццаці мы зазбіраліся дадому. Я, Квіда, Сара, Ваят, Бланка, Ёзэф, Бэрэніс, Хрыстыян і Ган. Прыкольна, як Ган развітваўся. Мы страшэнна спяшаліся, бо не паспявалі на цягнік. Ган ужо абуваўся, калі Леанардаў бацька запытаўся, ці было ў яго паліто, а Ган яму гаворыць: “Было, але зараз ужо ўсё роўна”. Але потым усё ж знайшоў яго, і мы паляцелі. Выйшлі ў Празе на Сміхаўскім вакзале. Было каля поўначы. Бланка, Бэрэніс з Сарай пайшлі, Хрыстыян дзесьці згубіўся. Мы селі ў трамвай. Тут з намі здарылася адна непрыемная, але страшэнна прыкольная гісторыя. У трамваі мы ехалі адны. Кіроўца быў у пярэднім вагоне. Мы дурэлі, віслі на парэнчах і г. д. Запалілі цыгарэту, але тут жа яе затушылі, бо за намі ехаў яшчэ адзін трамвай, і той кіроўца пагражаў нам кулаком. Квіда выйшаў, каб далей ад граху. На святлафоры наш трамвай спыніўся, той,

каторы за намі ехаў, таксама. Раптам кіроўца таго другога трамвая выйшаў і, трасучы кулаком, пайшоў да нашага. Мы здзервянелі. Ваят падышоў да дзвярэй і кажа: “Пайшлі, пацаны, пакуль не позна”. І рассунуў дзверы. Мы па адным выскачылі на вуліцу. Калі нам ужо нічога не пагражала, пачуўся свіст Квіда. Ён расказваў, што было смешна глядзець, як мы выскоквалі з дзвярэй. Той кіроўца, каторы “наш”, кажа, увогуле нічога не бачыў, а той другі прывёў яго ў пусты вагон. “Наш” думаў, што ён вар’ят,  бо ў вагоне нікога, зусім нікога не было. Пасля нас спыніла паліцыя, але ўсё было нармальна, яны былі досыць ветлівыя. Буэ. Ваят таксама сабраўся дадому, а я, брат і Квіда разам з Ганам чакалі трамвая. Яго доўга не было, Ган трохі каніў, бо інтэрнат маглі зачыніць. Мы запрашалі яго да Квіда на гарбату, там бы ён і пераначаваць мог, але тым часам нейкі трамвай усё ж прыехаў. Мы былі так прыемна пад мухай. Пайшлі спаць да Квіда. Было клёва. Магу сказаць, што гэта адна з самых лепшых вечарынак, на якіх я быў. Раніцай таксама ўсё было супер. Я прачнуўся з нейкім дзіўным, лёгкім бадунцом. Нас чакала яшчэ адна клёвая туса. Маркета спраўляла дзень нараджэння. Я напісаў пра гэта Квіда, мы з братам туды паехалі. Гэта дзесьці за Зліхавам. Па дарозе мы гутарылі, было файна. Калі мы ўрэшце прыйшлі да патрэбнага дому, брама была зачыненыя. Я пералез і пазваніў. Нам выйшаў адчыніць Робін. Там ужо былі Боршч, Мухамед, Вера, Ярка, Іва, Робін і Маркета. І віно + нікатын. Было здорава, так спакойна. Я паставіў Мэлані[6], а гэта такая цудоўная музыка. Супер. Неапісальна прыгожа. У Робіна быў нейкі песімістычны настрой, я быў п’яны і так стараўся яго развесяліць, што перакуліў яго. Ён хацеў парэзацца, разануў крыху па далоні, а потым рэзка павярнуўся і выпадкова параніў мяне. Я няслаба так крывавіў. Потым я ўбачыў вазу з кветкамі – цюльпаны. Адзін быў зламаны. Я ўзяў драўляную палачку, пластыр, нажніцы і склеіў яго. Наклаў цюльпану гіпс. Пасля пацалаваў яго і нырнуў у натоўп і вір незвычайнай тусні. Патэлефанаваў мамцы, каб спытаць, ці можна мне тут застацца. Яна дазволіла, сказала яшчэ, што тут Квіда і Роланд і яны не могуць нас знайсці. Я патэлефанаваў ім, у запале гарлаў у тэлефон, быў шчаслівы, растлумачыў ім дарогу. Праз паўгадзіны яны ўжо былі тут, залітыя ромам. Пасля адзінаццаці мы з Роландам звалілі.

Пайшлі на трамвай. Магу сказаць, што гэта быў самы вясёлы трамвай у Празе. Наваліліся нейкія п’янчугі з гітарай і на ўвесь трамвай пачалі спяваць класныя эвэргрыны. Людзі, што заходзілі, далучаліся і таксама спявалі. На плошчы Міру мы выйшлі. Роланд пайшоў спаць у нейкі склеп, а я, хістаючыся, пабег на метро. На пляцоўцы перад метро тусіў файны народ. Здаецца, чатыры дзеўкі і два хлопцы. У аднаго хлопца і дзяўчыны былі гітары. Хлопец брынькаў, а дзяўчына адбівала рытм на ўнутраным баку гітары. Я, калі прабягаў побач, закрычыў ім: “Едзеееeем!” І ў мяне выпаў ключ. Дзякуй за гэта Богу. Усе з віскатам кінуліся падымаць гэты ключ.

[6] Маецца на ўвазе Мэлані Эн Сафка-Шэкерык (нар. у 1947) – амерыканская спявачка, шматразовая ўдзельніца фестываля ў Вудстоку, найбольш папулярная ў 70-я гады сярод хіпі.

ПрайдзіСвет




Я апынуўся ў кучы чалавечых целаў, прыгожых людзей. Нарэшце, ключ быў у мяне ў кішэні. Я застаўся стаяць на каленях, а ў галаве ў мяне насілася некалькі думак… Насупраць мяне таксама на каленях стаяла адна дзяўчына. Яна абняла мяне і пачала гаварыць хутка-хутка. Я ўсяго не запомніў, але прыблізна так:

“Я цябе ведаю, ты хацеў граць з Норбертам на бубнах (?), у цябе двухметровая люлька, я цябе ведаю, у цябе драўляны парасон і двухметровая люлька. Дзе твая двухметровая люлька, двухметровая? Ты мой харошы…”

Пры гэтым яна цалавала мяне, той хлопец падышоў да нас, мы ўсё стаялі на каленях, а ён пачаў граць фантастычны блюз. Пасля мы ўсталі, я атрымаў цыгарэту “Мальбара” і крону на метро. Усе гэтыя пацалункі, уці-пуці і хіхі-хаха ўзносілі да нябёс. Пасля я вызваліўся з абдымкаў і ўвайшоў у савецкі вагон, які без прыгодаў давёз мяне да станцыі “Маластранская”, дзе я зноў нырнуў у цемру. Той бычок ад “Мальбара” я хаваю ў калідоры дома. Заўсёды, калі праходжу побач, усміхаюся, узгадваючы.

prajdzisvet.org

Дні бягуць, ручаі цякуць, сонца заходзіць і зноў выходзіць, на свеце нараджаюцца і паміраюць людзі, жывёлы і будынкі. Надыходзіць вясна, вельмі цёпла. П'яны Мухамед, Сайман у Богніцах, Зямля круціцца, а вецер дзьме. Боршч парадкам мне надакучыў. Аднойчы ідзем з Сарай па Маластранскай, бачым дзве постаці, адна з іх хістаецца. Сара кажа, ці не Боршч гэта часам. Я зразумеў яе, ну але што з таго, я паціснуў плячыма і хацеў ісці далей. Але ўбачыў там яшчэ Марціна, Маркету, Робіна, дык падышоў да іх. Гэта сапраўды быў Боршч. У яго не было акуляраў, з носа цякла кроў. Ён быў п'яны, як свіння. Я адразу зразумеў усё пра страчаную экзістэнцыю гэтага свету. Баршча цягнула яшчэ адна дзяўчына, я яе не ведаў, яе звалі Марціна. Мы ўсе былі ў ягонай крыві. А ён усё падаў і падаў наперад, крычаў, што мы курвы і г. д. Заехаў мне па шчацэ, у нейкага мінака запусціў торбай. Дзяўчаты сказалі, што цягнуць яго ажно з Карлштэйна. Мне зусім не хочацца пісаць пра тое, як ён усіх выбесіў, усё сапсаваў і г. д. Ён ідыёт, бо калі працверазеў, пачаў гэтым выхваляцца, нават цяпер яшчэ выхваляецца. На шчасце, мы сустрэлі Хрыстыяна. Ён малайчына. І ведае, што ў такіх выпадках рабіць. Спачатку ён яго супакоіў, а пасля мы адвялі яго спаць у той дом, дзе жыве Квіда. Марцін быў супер, упершыню ў жыцці я пачуў ад яго штосьці разумнае. Шкада, што ён не ўвесь час такі. Мне ад гэтага ўсяго стала паршыва, і мы з Марцінам зайшлі выпіць кавы. Пасля з'явіўся Квіда, адвёў Баршча спаць да сябе, а мы пайшлі да Ваята патусавацца. Звонку ў кавярні сядзеў Хрыстыян і нейкія тры хлопцы. Я запрасіў іх з намі, за што Квіда на мяне раззлаваўся. Пры гэтым ён сам казаў, што можна запрашаць кожнага, каго сустрэнем. Нешта нашае братэрства трашчыць па швах. Мы пайшлі на Град, а ў маёй галаве насіліся мелодыі Морысана. Зайшлі да Ваята, ён хацеў паслаць нас прэч, пасля ўсё ж пусціў да сябе, але быў злы (братэрства?). Мы з Хрыстыянам абмяркоўвалі "Кнігу Іруб", карты таро і кабалу. Ён малайчына. Там былі розныя людзі і яблычнае віно. Адзін хлопец умеў варажыць па руцэ. Выйшла, што я нарадзіўся для творчасці, аднак мая лінія розуму карацейшая, чым у Ёзэфа, але, у прынцыпе, добрая. А Ёзэф – незасяроджаны, але лінія розуму – доўгая. Пасля яшчэ выйшла, што я хутка памру і буду страшэнна хварэць! НЕ ХАЧУ! Скоцкі лёс. Гэта мяне расхвалявала, але час лечыць, толькі вось я быў у "цемры". Марціне нядаўна споўнілася дзевятнаццаць, а таму сваё каханне я бачыў у чорным свеце. З Леанардам і Марцінай мы дамовіліся, што паедзем у Іспанію. Ваят раззлаваўся. Мы з Леанардам пайшлі і па дарозе дыскутавалі на філасофскія тэматы. Назаўтра я пачуў ад брата, што ён, Хрыстыян, Марціна і тыя тры хлопцы пайшлі на нейкую кватэру. Адзін з іх там жыў. Яны да самай раніцы пілі ром і трындзелі. Калі вярталіся назад, Ёзэф з Хрыстыянам ішлі разам, а ў метро нейкі гомік даў ім пачак цыгарэт. Яны былі добра п'яныя. А дні ішлі, зноў і зноў ішлі і ішлі.

На Пэтршыне мы зладзілі джэм-сэйшн. Густэл, Павел і я. Яшчэ там быў Леанард, Ярка і Мірык, але яны не ўдзельнічалі. У нас была бутэлька

чырвонага віна, дзве скрыпкі, балалайка і бонга. Было здорава, сонца ўсміхалася. Пасля мы сабраліся і пайшлі да Квіда. Там былі Робін, Маркета, Бэрэніс, Ёзэф, Марцін, Рой і і г. д. Мы пачалі граць, узнялі страшны вэрхал, запісвалі ўсё на бабіну. Я, відаць, быў у экстазе, бо гарлаў, як бык, і граў на скрыпцы дзіўныя мелодыі. Потым мы зноў пайшлі на Пэтршын. Я даведаўся, што ў Міхаэля, нашага бубнача, сёння тусоўка. Адтуль да яго было недалёка, ён жыў над Лобкавіцкім садам. Я пайшоў паглядзець, што там і як. Там было чалавек сем. Яны сядзелі ў садзе і спявалі Гутку[7]. Там быў і Ган. Я запытаўся ў Іржыны, ці можна запрасіць некалькі чалавек. Яны згадзіліся, я паклікаў усю нашую банду. Большасць адно аднаго ўжо ведалі. Там было шмат віна і музыкі. Міхаэль вынес у сад драбавік і мы гралі. Цікава. Я ў адзенні купаўся ў басейне, прычым зваліўся туды разам са скрыпкай, цяпер мне трэба новы смычок, бо старому нават каніфоль не дапаможа. Потым народ пачаў разыходзіцца; Марцін, Квіда (той увогуле быў нейкі дзіўны) і інш. Засталіся я, Ёзэф, Бэрэніс і тыя людзі. Брат пайшоў правесці Бэрэніс, а я вырашыў яшчэ трохі тут патусіць. Пасля таксама пайшоў. На Маластранскай сустрэў Пастамента, ён быў пад мухай. Потым з’явіўся брат і сказаў, што згубіў пакет са сваімі рэчамі. Там былі і мае рэчы. Мы пайшлі шукаць, пашыбавалі ўверх па Улашскай, ці не пакінуў ён рэчы там, у садзе. Па дарозе сустрэлі нейкіх патлатых. Спачатку адзін з іх папрасіў у мяне скрыпку і пачаў граць песню “Пластыкаў”. Мы не ведалі, ці можам узяць іх туды з сабой. Урэшце махнулі на ўсё рукой і пайшлі разам. Зноў паселі ў садзе, але пакет як скрозь зямлю праваліўся. Брат з нейкім хлопцам гаварыў пра Кліму[8], Ніцшэ, увогуле пра філасофію. А пачалося ўсё з таго, што Ёзэф да яго падсеў, паглядзеў яму проста ў вочы і сказаў: “Што ў цябе на твары? Што там у цябе? Нічога…” і г. д. Я быў за яго рады. Я ведаў, што тут ён на сваім кані. Нарэшце, мы развіталіся. Двое пацягнуліся на Пэтршын, двое да Града, а двое пайшлі з намі. Унізе нас спыніў паліцэйскі. Такі малады, яны мяне здзіўляюць. Адзін з нашых усё шукаў запалкі, пытаўся ва ўсіх па чарзе: “Аганьку не будзе? Аганьку не будзе?” І ў таго маладога паліцэйскага запытаў: “Прашу прабачэння, у вас часам аганьку не будзе?” Той даў яму запалкі, і мы пайшлі далей. Ля Карлавага моста мы развіталіся. Мы з братам пайшлі дадому. Я быў галодны, на стале быў біфштэкс і гарох. Мы кінуліся на ежу, як варвары, елі рукамі. Гарох быў у мяне на твары, у Ёзэфа таксама. Урэшце Ёзэф узяў прыгаршч гароху і размазаў яго мне па мордзе, я зачарпнуў гарох і ўпрыгожыў брацельніку валасы. Мы смяяліся, я адкрыў слоік гарчыцы і пафарбаваў Ёзэфа, а ён нафарбаваў мне ўвесь жывот. Пасля мы абодва скочылі памыцца, а затым – у ложак…

У той дзень Ёзэф быў абраны каралём гімназіі.

[7] Яраслаў Гутка – чэшскі бард, у 1978–1989 жыў у выгнанні ў Нідэрландах.
[8] Ладзіслаў Кліма (1878–1928) – чэшскі пісьменнік і філосаф, блізкі да эстэтыкі экзістэнцыялізму і суб’ектыўнага ідэалізму.

А потым пачаліся Восьмыя пражскія джазавыя дні. Катарсіс, які цяжка апісаць. Гэта трэба перажыць на ўласнай скуры. Яны доўжыліся з серады да нядзелі, я ж пагрузіўся ў музыку з пятніцы. У пятніцу я нават яшчэ не ведаў, што пайду туды. У мяне не было ні квітка, ні цікавасці, але дзякуй Богу, што пайшоў. Калі мы ішлі па Карлавым мосце, то сустрэлі п’янага Ёзэфа з яшчэ больш п’яным Леанардам, Маркету, Робіна і Салаўя. Яны вярталіся з Пэтршына, дзе Леанард лез на дрэвы і кідаўся ў людзей галлём. Пасля зваліўся. Мы пайшлі разам. У “Люцэрне” было клёва. Музыка. ЯКАЯ МУЗЫКА!!! Я быў п’яны, але было здорава. Я любіў усіх людзей на свеце. Хачу сказаць, што больш за ўсё на канцэртах мне падабаецца музыка і тулянне, вось так: музыка і тулянне. Бадзяешся сабе, а пры гэтым з табой здараюцца нейкія прыгоды, ты бачыш нейкіх людзей, адчуваеш, што закахаўся ў іх і г. д. Гэта лепш, чым проста сядзець дзесьці на прыпёку. Цяпер, калі я стомлены, то падаю на крэсла, заплюшчваю вочы і ўяўляю. У большасці выпадкаў я ўяўляю твары, яны чаргуюцца, адзін твар змяняецца другім, з’яўляюцца ўсё новыя і новыя… у маіх уяўленнях была і Марціна, тая самая, што цягнула Баршча з Карлштэйна. Я сказаў ёй, што кахаю яе, мне хапіла адвагі, я быў п’яны, але казаў праўду. Аднак нічога не адбылося. Нават горш. Яна, як і раней, была з Баршчом. Як жа я яго не люблю… Мне не шанцуе, вось і ўсё, але я ўжо прывык, таму і настрой у мяне быў добры. Толькі адзін раз: я запытаўся, ці адкажа яна на маё каханне, а яна зрабіла выгляд, што не разумее, пра што я. Калі яна ад мяне выкруцілася, тут ужо я не вытрымаў, зароў, як паранены бык, і ў шаленстве пляснуў торбай аб падлогу. Я ніколі не забудуся на гэта. Назаўтра мы пайшлі ў “Фаліманку”. Гэта спортзала, таму да “Люцэрны” ёй далёка. Людзі былі добрыя, месца – жахлівае, але ў прынцыпе прымальна. Спачатку мы не маглі адшукаць, дзе гэта, але вакол было шмат добрых людзей. Яны віравалі па ўсім наваколлі, гэта нагадвала лагер хіпаноў. Музыка была добрая, пасля – перапынак на абед, было горача, мы пайшлі ў найбліжэйшы бар, выпілі ліманаду. Цягаліся па наваколлі і разглядалі “лагер”. А пасля абеду – зноў музыка… Рух, усё і ўсіх яднаў несупынны рух, менавіта такі рух – аснова ўсяго. Хлопец, які прадстаўляў гурты (паміж намі, той яшчэ ідыёт), сказаў, што першага чэрвеня ў Польшчы павінен адбыцца канцэрт Фрэнка Запы. Але гэты канцэртмейстэр, здаецца, добры манюка. Пасля таго, як скончыўся пасляабедзенны канцэрт, мы пайшлі пешкам на Вацлаўскую плошчу. Я быў стомлены, мне хацелася есці і піць. Мы дацягнуліся да “Люцэрны” і першае, што зрабілі – кінуліся ў буфет. Я з’еў нейкую жахлівую густую бурду, якую тут называюць супам з гародніны. Заеў усё гэта хлебам і запіў півам (!?) – было жахліва, але я быў п’яны. Той суп быў такі жаўтлявы, і ў ім плавала нейкая вараная трава – ці што гэта было? Але мы ўжо былі ўнутры. Гэта быў найлепшы вечар за ўвесь фестываль. Нейкія ангельцы гралі суперскі псіхадэл, у бубнача патлы былі да пояса, граў ён клёва, а ВАКАЛ! Спявала нейкая цётка, так здорава, я пераклаў толькі адзін выраз: “Блад оф мэн”

(“Кроў з мужчыны”). Хацелася б пачуць тыя тэксты цалкам. Я ўбачыў там аднаго знаёмца, той дамовіўся наконт канцэрта нашага гурта. Супер. Пасля я ўбачыў там дзвюх дзяўчат, тых сясцёр, калі памятаеце, мы хацелі іх падклеіць падчас рок-н-рольнага Вялікадня, яны тады яшчэ ад нас уцяклі, яны яшчэ падыходзілі да мяне на “Сунічнай пракламацыі”. Мы скінуліся на віно, купілі чырвонае, прыселі ў зацішным месцы і ўтраіх выпілі. Я быў добра-такі п’яны. Ленка мне падабаецца. Пасля ўсё скончылася (на жаль), я вярнуўся дадому дзесьці а першай ночы. А раніцай, а дзесятай (Божа), мы праспалі. Я пабудзіў брата і мы паляцелі ў “Фаліманку”. У той дзень там было лепш за ўсё. Акрамя ўсяго іншага, тады там быў і панк. Але класічны. У аднаго з музыкаў адна рука была жоўтая, а другая – блакітная, зялёная морда, размаляваная белымі пражылкамі. У другога быў цёмны твар, белыя вусны і вочы, а на патыліцы была прычэпленая маска, так што здавалася, быццам у яго два твары. Іх было трое. Гурт называўся “Kilhets”. Музыку яны гралі так сабе, хутчэй абы-што, але часам гучала нармальна. Раптоўна яны перасталі граць, змоўклі, а пасля адзін за адным паселі на падлогу. Маўчалі і сядзелі, як статуі. Некаторыя з публікі пачалі разыходзіцца, а некаторыя сцябаліся. Хвілін праз пятнаццаць музыкі падняліся і зноў пачалі лабаць. Хоць нейкае шоў. Потым я паехаў дадому, паабедаў. Пасля трох я зноў пайшоў у “Люцэрну”. Там быў Пэтр, ён клёвы, Рой, Ленка, Ліда і Марціна. Яна так мяне замучыла, спадзяюся, ненаўмысна. Канцэрт быў абы-які. Там былі толькі спевакі, але ў канцы было добра. Гралі Стывен і Фаўр (ён бубнач), яны такія зладжаныя. Пэтр адразу пайшоў дадому, яму трэба было ў Бэхіню, я застаўся адзін, толькі Марціна са мной размаўляла. Гэта было так дзіўна, яна зноў не магла нічога адказаць, гэта мяне забіла. Пасля прыбегла Пэтра, але зноў праз хвіліну пайшла, бо ёй балела галава. Я застаўся адзін…

І зноў, джазавы фестываль скончыўся, застаецца толькі пусціць слязу ды ўспомніць, як гэта было, і кінуцца ў новае жыццё. Нядаўна была тусоўка, хутчэй вечарына. Мы дамовіліся сустрэцца на Маластранскай. Хацелі пайсці пакупацца на Лібачак, мы цяпер туды часта ходзім. Перад вечарынай таксама там былі, купаліся голыя, ноч была цёплая, вада таксама, было здорава. Мы чакалі яшчэ пару чалавек, Марцін раптоўна ўзгадаў пра нейкую тусу ў Браніку. Мы плюнулі на Лібачак і пайшлі тусіць. Хвіліну яшчэ пачакалі, і тут – каго я бачу! Ленка. Яна такая прыгожая… ?§!, ?

Яна не магла паехаць з намі, так шкада, там былі дзеўкі, дзве, не сказаць, каб вялікія кралі. Калі мы даехалі, Ёзэф і Хамелеон пайшлі па віно. Купілі вядро піва і пляшку віна, віно было проста жахлівае. У іх дома было кацяня, вельмі прыгожае. Мы з Роландам заперліся ў нейкім пакоі і елі свае прыпасы. Пасля пайшлі на кухню пашукаць нож, а калі вярнуліся, то ўбачылі, што гэтае кацяня аблізвае нашую кілбасу. Мы палеглі на падлозе і назіралі за ім, кармілі яго кілбасой і апельсінам, а потым яно яшчэ і газіроўку лакала. Пасля заснула. Роланд пераказваў мне апавяданне Кафкі, дзе чалавек прачынаецца – і хоп, а ён ужо і не чалавек, а велізарны лускаваты жук. Фу

Прайдзісвет

блін, брыдота… Я быў п’яны. З музыкі там гралі “Цэпеліны”, яны мне, у прынцыпе, падабаюцца, а так больш гучала нейкая мешаніна.



“...Нядаўна была тусоўка, хутчэй вечарына...”

Каля дзесяці Роланд пайшоў, а пасля прыйшлі такія дэбілы. Божа ж мой, якія гэта былі ідыёты. Сапраўдныя скаты, скаты, сукі і г. д. Калі знаёміліся, адзін сказаў, што яго завуць Іструбаз, а ягонага брата – Марольд. Мы глядзелі “Клан марсэльцаў”, мне было нецікава, думаю, не толькі мне. Але ж гэтыя новыя: бляяя, гэта ж Бельмандо, ёб тваю! Потым гаспадыні прыйшла да галавы ідэя, яна сказала, што зараз вернуцца бацькі, толькі што патэлефанавалі, а таму трэба хуценька ўсё прыбраць і зваліць. Нармальным людзям яна сказала, што гэта ўсё лухта, а тыя два дэгенераты звалілі. Але ненадоўга. Праз хвіліну яны залезлі назад праз акно. Але зноў-такі ненадоўга, бо да нас у госці завіталі два паліцэйскія. Пачалі ва ўсіх правяраць дакументы, цікава, што мяне зноў не заўважылі. Пасля пачалі пытацца, хто прыйшоў апошні. Тыя дурні сказалі, што яны. (У аднаго з іх не было пашпарта.) Тады ахоўнікі парадку спыталі ў іх, як яны сюды трапілі. Тыя

prajdzisvet.org

спачатку адпіраліся, а пасля прызналіся. Але столькі выкручваліся, адзін паліцай ужо нават пачаў злавацца, а мы ўсе смяяліся. Урэшце той паліцэйскі махнуў рукой, прамармытаў нешта пра вар'ятаў. А перад тым другі паліцэйскі пакінуў на стале ліхтарык, а Марцін паклаў яго на шафу. Калі паліцай запытаўся, дзе ліхтарык, Марцін падаў яму яго, а той пачаў вапець пра спробу крадзяжу. І пры гэтым усміхаўся. І Марцін таксама. Разгублены, ён так смешна выглядаў. Мы ўсе рагаталі, але мне здаецца, што гэта быў хутчэй смех істэрычны, кожны радаваўся, што для яго ўсё скончылася. Урэшце яны аддалі нам усім пашпарты, сказалі, каб мы не ўздымалі тут вэрхал, а так усё нармальна. Прыкольна, што яны нас тут знайшлі. Цяпер, калі нехта званіў, мы шчаміліся ў адзін невялікі пакойчык і кідаліся на адзін ложак, былі як куры ў куратніку ці як банда гомасэксуалістаў. Там быў і Сайман. Сайман ВЯРНУЎСЯ! Я так рады, бо нам яго тут не ставала. Шкада, што яго не было з намі падчас джазавых дзён. Пасля прыдуркі пайшлі, засталіся толькі я, Ёзэф, гаспадыня, Ярка, Марцін, Ірка і Сайман, але ён пайшоў спаць. Марцін і Ярка ўмазаліся. Мы трындзелі і пілі, было здорава і прыкольна. Я купаўся ў ваннай, халодная вада сціскала мяне абцугамі (цёплай не было), у вадзе плаваў начны матылёк (утапіўся), кавалкі хлеба і недапалкі. Мы амаль што голыя бегалі ў ваннай і пырскаліся вадой. Дзесьці каля другой зваліў Хамелеон. Каля пяці я ўрэшце адшукаў сабе нару, ложак, і толькі з падушкай заснуў. Мне прысніліся парашутысты, а раніцай каля дзевятай я прачнуўся з ліхтарыкам пад галавой. Пасля дзесяці мы звалілі. Пайшлі купацца на Лібачак. Ваят прыехаў туды на ровары, пасля ён прабіў кола. І зноў было клёва, але мне здаецца, што гэта нас забівае.

**Паслямова**

Гэта быў дзіўны час. Я прыйшоў на бязмежна, невычэрпна багаты і каляровы свет. У гэтым свеце мне, як і кожнаму іншаму, давялося сталець і фармавацца.

Думаю, мала каму пашэнціла спазнаць столькі адценняў бясколернай шэрасці.

Мы з сябрамі пакрысе знаёміліся з андэграўндам. Звычайна мы збіраліся на Малай Стране – альбо ў "Маластранскай кавярні", альбо на кватэры Вітэка Круты на Тамашскай вуліцы. Гэта было класічнае таварыства маладых творцаў. Там мы дыскутавалі, спрачаліся, часам выпівалі, у паветры адчуваўся дзявочы водар, але, у адрозненне ад нейкіх там французскіх пестункоў, вакол нас паўсюль панавала тая стракатая шэрасць і боязь паліцыі.

З дзесяці чалавек сфармавалася ядро таварыства – і мы пачалі выдаваць зборнік "Дзесятка". Зразумела, у дзесяці копіях. Літаратура і графіка. Пазней літаратура пачала выходзіць на першы план. Так узнік "Віяліт" – гэтакі стрыечны брат "Дзесяткі". Назва "Віяліт" – ад слова "вілюзіянізм". Гэта быў незвычайны мастацкі кірунак, які мы самі прыдумалі. Дэфініцыю яму далі

мой брат Яхім і Ян Млынарык у першым маніфесце. Памятаю, адна з асноўных тэзаў гучала так: “Вілюзія – гэта ўсё”. Дзіўна, але ўсе сябры нашага таварыства жывуць і сёння, а некаторыя з іх нават прымудрыліся стаць досыць паважанымі людзьмі.

У тыя часы я спрабаваў заснаваць гурт, які пазней стаў асновай “Воінаў-псоў”. Я ўжо гаварыў пра паступовае збліжэнне з андэграўндам. Насамрэч мы проста кінуліся галавой у вір. У 1978 годзе Вацлаў Гавал запрасіў нас з братам на прэм’еру “Велікодных містэрый” гурта “The Plastic People of the Universe”. Да таго часу я ўжо паклаў на музыку некаторыя Яхімавы тэксты, праўда, пакуль толькі на фартэпіяна. Вацлаву гэта спадабалася, ён захацеў, каб мы выступілі ў “Пластыкаў” на разагрэве. Мы паехалі. Гэта быў неапісальны шок. Атрымаўся выдатны старт. Старт у той шэры акіян. Пасля ўзніклі “Воіны-псы”, але гэта ўжо іншая гісторыя.

Навошта я напісаў гэтую кнігу? Захацелася пакінуць нешта такое, дзе проста распавядаецца пра жыццё некалькіх маладых людзей. Я пісаў яе на працягу 1979 года, таго года, калі мне было 13, а сабраў я свае занатоўкі, відаць, тады, калі мне споўнілася 14. Я перапісаў кнігу ў дзевяці асобніках і раздаў сябрам. Я змяніў усе імёны, зразумела, дзеля паліцыі. На маё здзіўленне, гэты тэкст ніколі не трапіў у яе лапы (прынамсі, я так думаю). У дадзеным выданні ўсе імёны я пакідаю змененымі. Хто хоча, той сябе там знойдзе.

З 1979 года шмат што змянілася. Цяпер таксама дзіўная эпоха, але яна значна больш каляровая. Я б хацеў, каб вы ведалі, што “Мне 13” – гэта праўда, якая была і ёсць.




Прага 8.4.1994

*пераклад з чэшскай* – Наталля Пяткевіч пры ўдзеле Сяргея Сматрычэнкі

© Filip Topol, 1995
© Наталля Пяткевіч, Сяргей Сматрычэнка, пераклад, 2010

prajdzisvet.org